ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Настаўніцкая газета

№ 6(5188)
Аўторак,
16 студзеня
2001 года

Выходзіць з 20 снежня 1945 года

Кошт у розніцу — 47 руб.

Рэформа школы — у дзеянні

Трапіць у дзесятку

На мове стралкоў гэта азначае высокае майстэрства. У апошні час такая тэрміналогія стала характэрнай і для вучняў сярэдняй школы №1 Шчучына. Тут праводзіцца вядомы эксперымент, сутнасць якога ў тым, што пашырана шкала ацэнкі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў да дзесяці балаў. Пра тое, як праходзіць эксперымент, расказвае дырэктар школы К.К.Хрыптовіч.

— Ці паўплывае новая сістэма ацэнкі ведаў вучняў на паляпшэнне якасці ведаў і павышэнне ўзроўню выхаванасці вучняў?

— Бясспрэчна, сістэма ацэнкі вынікаў працы школьніка мае вельмі важнае значэнне ў арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. Існуючая ж пакуль што сістэма ацэнкі ведаў не дае магчымасці дыферэнцыраваць веды вучня, ускладняе ўстанаўленне адзіных падыходаў да якаснага і колькаснага ацэньвання вынікаў навучання. Пашырэнне шкалы ацэнкі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў да дзесяці балаў абумоўлена як неабходнасцю ў аб'ектыўным ацэньванні ведаў і навыкаў школьнікаў, так і ва ўзмацненні стымулюючай ролі адзнакі, уліку індывідуальных якасцяў вучняў як асоб.

— І з якога часу ў Вашай школе праводзіцца эксперымент?

— Падрыхтоўчы этап пачаўся з 21 лютага мінулага года. Задзейнічаны чатыры эксперыментальныя і кантрольныя класы, 36 настаўнікаў. Праведзена папярэдняя растлумачальная работа з педагогамі, вучнямі, бацькамі. Усе яны з разуменнем і адказнасцю аднесліся да эксперыменту.

— Калікс Каліксавіч, справа, за якую Вы ўзяліся, новая. Хацелася б даведацца пра яе больш падрабязна.

— Усе вучні эксперыментальных класаў былі забяспечаны крытэрыямі ацэнкі, лісты з якімі ўклалі ў дзённікі. Настаўнікі атрымалі інструктыўна-метадычныя матэрыялы па дзесяцібальнай сістэме ацэнкі ведаў і навыкаў школьнікаў, дзе змешчаны прыкладныя нормы ацэнкі па вучэбных курсах і прадметах з 5 па 11 класы. За перыяд падрыхтоўчага этапу настаўнікі і вучні вывучылі патрабаванні 10-бальнай сістэмы да выстаўлення адзнак.

— З пачатку правядзення эксперыменту прайшло яшчэ мала часу. Ці ёсць якія-небудзь зрухі?

— Выявілася, што дзесяцібальная сістэма дае магчымасць пашырыць выкарыстанне розных відаў, метадаў і форм кантролю, ухіліць шэраг негатыўных з'яў, якія могуць узнікнуць пры чатырохбальнай сістэме. Гэта падштурхнула калектыў школы пры апрабацыі дзесяцібальнай шкалы да пошуку альтэрнатыўных і больш рацыянальных падыходаў у ацэначнай дзейнасці. Лічым, што неабходна ўзброіць вучняў тымі крытэрыямі, кіруючыся якімі, яны будуць таксама, як і настаўнікі, рабіць ацэнку і самаацэнку сваёй працы.

Мы дамовіліся ранжыраваць ступень значнасці кожнага віду праверачнай работы ў працэнтах, каб у суме ўсе праверачныя работы за тэму або за чвэрць складалі 100 працэнтаў. У сувязі з гэтым настаўніку эксперыментальных класаў у пачатку кожнай чвэрці неабходна прадумаць усе віды праверачных работ па прадметах, за якія ўжо будуць выстаўлены адзнакі ў выглядзе балаў і працэнтаў. Адзнакі фіксуюцца ў дзённіках вучняў, журнале, але без працэнтаў. Да вашага ведама, двойка — гэта "0" балаў, тройка — 1, 2, 3, 4 балы, чацвёрка — 5, 6, 7 балаў, пяцёрка — 8, 9, 10 балаў.

У педагогаў з'явілася магчымасць вышэйшай адзнакай у 10 балаў адзначаць школьнікаў, якія працуюць творча і маюць больш глыбокія веды, чым патрабуе праграма. І разам з тым адпала магчымасць "збіваць" вучня на "2", так як "0" балаў, якія адпавядаюць "2", могуць быць выстаўлены пры адсутнасці адказу ці пры адказе са шматлікімі памылкамі, якія не ўхіляюцца пры дадатковых пытаннях настаўніка. Іншых сітуацый для выстаўлення "0" балаў няма.

Ва ўмовах эксперыменту вучні дзевятых класаў могуць атрымаць пасведчанне аб базавай адукацыі або залаты медаль за курс сярэдняй школы пры наяўнасці 8, 9, 10 балаў, якія адпавядаюць "5" з дзвюх "4", якія, у сваю чаргу, адпавядаюць 6, 7 балам.

— Што ўсё такі дае ўвядзенне ранжыраўкі ступені значнасці кожнага віду праверачных работ у працэнтах пры дзесяцібальнай сістэме ацэнкі?

— Прааналізаваўшы набыты вопыт у эксперыментальных класах, можна зрабіць выснову. Гэтая сістэма больш аб'ектыўная і справядлівая. Яна стымулюе працу вучня да больш высокіх вынікаў, ліквідуе недахопы ў выстаўленні выніковых адзнак, поўнасцю адпавядае прынцыпу гуманізацыі і дэмакратызацыі школьнай адукацыі. Такая ацэнка ведаў дае магчымасць пашырыць выкарыстанне розных форм кантролю, стымулюе настаўніка да творчасці ў ацэначнай дзейнасці (тэсты, залікі, творчыя работы, рэфераты і г.д.).

Параўнальны аналіз паспяховасці ў эксперыментальных і кантрольных класах паказаў яе павышэнне ў эксперыментальных. Пры данай сістэме настаўнік абавязаны выстаўляць адзнакі ў дзённікі школьнікаў у балах і працэнтах, што не заўсёды магчыма ў дзеючай сістэме ацэньвання. Класны журнал становіцца дакументам для налічэння зарплаты і кантролю за ходам вучэбна-выхаваўчага працэсу, ухіляюцца ўсе недахопы па вядзенні класных журналаў і іх захаванасці. Значна змяншаецца колькасць прычын для канфліктаў паміж вучнямі і настаўнікамі з-за неаб'ектыўнасці выстаўлення адзнак. Губляецца сэнс для школьніка не прыходзіць на кантрольную ці іншую праверачную работу, вынікі якіх ацэньваюцца ў балах і працэнтах. Ліквідуюцца непаспяховасць і другагодніцтва. Практыка паказвае, што другі год навучання ў адным і тым жа класе не дае станоўчых вынікаў. Нарэшце, медалістамі могуць стаць вучні з аб'ектыўна атрыманымі адзнакамі і глыбокімі ведамі па ўсіх прадметах. Думаю, што ў ходзе эксперыменту будуць выяўлены і іншыя станоўчыя якасці дзесяцібальнай сістэмы.

— Як вядома, гэта першы этап эксперыменту. А як ён будзе праходзіць далей?

— У гэтым навучальным годзе распачаўся другі этап эксперыменту — фарміруючы. Яго мэта — поўнамаштабная праверка гіпотэзы эксперыментальнага даследавання. Павялічваецца колькасць эксперыментальных класаў. У эксперымент уключаюцца іншыя віды вучэбных устаноў (ВНУ, тэхнікумы, ліцэі, гімназіі).

Эксперыментальная работа патрабуе ад яго ўдзельнікаў дадатковай затраты часу, творчасці і г.д. Загадам Міністэрства адукацыі ад 13 ліпеня 2000 года ўстанаўліваецца павышэнне ставак зарплаты на 15 працэнтаў настаўнікам, а дырэктару і яго намесніку — на 20 працэнтаў ва ўстановах, якія атрымалі статус эксперыментальных пляцовак.

Па ўсіх даных выніковасці дзесяцібальнай сістэмы праз год-два яна будзе ўкаранёна ва ўсіх вучэбных установах рэспублікі. Таму са згоды аддзела адукацыі пачынаючы з першай чвэрці мы запрашаем на семінары-практыкумы прадстаўнікоў школ раёна (у першую чаргу кіраўнікоў і намеснікаў) па вывучэнні тэхналогіі ўвядзення дзесяцібальнай сістэмы ацэнкі і ўвядзенні новай метадыкі выстаўлення выніковых ацэнак.

— У сувязі з новай формай арганізацыі работы ці ўзнікаюць у Вас якія праблемы і пажаданні?

— Ёсць просьба да аддзела адукацыі райвыканкама: неабходна вырашыць пытанне аб увядзенні ў штатны расклад пасады дыспетчара. Гэта звязана з тым, што тут 43 класы-камплекты, працуе завочнае аддзяленне, аддзяленне па навучанні хворых дзяцей у бальніцы, адкрыты два ліцэйскія класы, тры класы па паглыбленым вывучэнні прадметаў, пяць профільных класаў. Плюс яшчэ год напружанай працы па эксперыменце.

— Няхай ажыццявіцца ўсё задуманае, і поспехаў Вам у працы.

— Дзякуй.

Гутарыў Канстанцін КЛЕБАН.

Музей класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча

У Мінску ў Вышэйшым вучылішчы электронікі адбылося ўрачыстае адкрыццё музея Уладзіміра Караткевіча. У экспазіцыі сабраны фотадакументы, першыя выданні пісьменніка, публікацыі, афішы тэатральных спектакляў па яго творах.

НА ЗДЫМКАХ: музей адкрывае пісьменніца Вольга Іпатава (злева); пісьменнік Адам Мальдзіс віншуе дырэктара музея выкладчыка Пятра Жалнаровіча са стварэннем экспазіцыі; частка экспазіцыі музея.

Фота Мікалая ПЯТРОВА, БЕЛТА.

Правы дзяцей — права на будучыню

Пад такім дэвізам працуе ПТВ № 130 кулінарыі Чэрыкава Магілёўскай вобласці, займаючыся адукацыяй навучэнцаў у галіне правоў чалавека.

Узрост ПТВ — 23 гады. Заснавана вучылішча на базе былой школы-інтэрната. Больш як 5 тысяч спецыялістаў пайшло ў жыццё з нашых сцен. Рыхтуем людзей самых мірных прафесій: кухараў дзіцячага харчавання, кандытараў, прадаўцоў. Навучаем моладзь Магілёўскай, Гомельскай (у меншай ступені — Віцебскай) абласцей.

Праблема навучання правам чалавека існуе на розных узроўнях адукацыі. Не так даўно з прычыны вядомых гістарычных і ідэалагічных абставін гэтая праблема практычна не ўзнімалася, не знаходзіла яна належнага адлюстравання і ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ў адукацыйных установах, у вучэбных планах і праграмах. А вось сёння, як ніколі, мы ясна разумеем, што без такіх ведаў немагчыма ажыццявіць дэмакратызацыю і гуманізацыю грамадскага жыцця, пазбегнуць праяўленняў нецярпімасці, нацыяналізму і г.д.

Гэта актуальна для нашай сістэмы адукацыі, паспяховае рэфармаванне якой таксама немагчыма без уключэння ў змест навучання тэарэтычных і практычных пытанняў правоў чалавека. Пра павышэнне значэння праблемы правоў чалавека гаворыць і той факт, што Генеральная асамблея ААН абвясціла 1995 — 2005 гады Дзесяцігоддзем адукацыі ў галіне правоў чалавека.

Працуючы па адукацыі ў галіне правоў чалавека, ПТВ-130 кулінарыі кіруецца наступнымі важнымі падыходамі.

У арганізацыі жыццядзейнасці падрастаючага пакалення ісці ад дзіцяці, а не да дзіцяці са сваімі патрабаваннямі і ўказаннямі, як гэта было ў традыцыйнай педагогіцы. Такі падыход забяспечвае дзіцяці сацыяльную абарону (рэалізацыя правоў дзіцяці ў сям'і, навучальнай установе, грамадстве і г.д.), сацыяльную адаптацыю (стасункі падлеткаў паміж сабой, з навакольным асяроддзем і светам) і сацыяльныя гарантыі (развіццё дзіцяці як асобы, яго схільнасцей, здольнасцей, магчымасцей).

Сям'я, навучальная ўстанова, грамадства пастаўлены ў роўныя ўмовы — гэта значыць ва ўмовы прафесійнага, кампетэнтнага ўдзелу ўсіх дарослых у развіцці асобы падлетка.

Сістэма работы па данай праграме закладзена ў мэтавай комплекснай праграме выхаваўчай работы вучылішча "Знайдзі сябе" (раздзел "Чалавек, свабода, права").

Яна ўключае і распрацоўку з навучэнцамі агульнавучылішчных дакументаў, якія вызначаюць іх правы і абавязкі ў вучэбным, грамадскім і культурным жыцці (правілы паводзін на вечары адпачынку; абавязкі старасты; абавязкі дзяжурнай групы і г.д.); правядзенне ролевых гульняў "Паводле якіх правілаў мы жывём", "Чалавек і закон" і г.д., дыялогаў "Ці ведаеце вы сябе?", інфармацыйных гадзін, тыдняў прававых ведаў, дзён прафілактыкі, сустрэч з работнікамі праваахоўных органаў (вечары пытанняў і адказаў, брэйнг-рынгі, дыскусіі, дыялогі); работу лектарскай групы па прапагандзе і тлумачэнні асноўных палажэнняў Закона аб правах дзіцяці; арганізацыю выстаў і чытацкіх канферэнцый па творах пісьменнікаў-гуманістаў і г.д.

Навучальная ўстанова сёння — тое месца, дзе правы чалавека не толькі вывучаюцца, а і рэалізуюцца, бо ў дакументах нашай рэспублікі аб правах дзіцяці (законы Рэспублікі Беларусь "Аб правах дзіцяці" і "Аб адукацыі") вызначаны ўмовы, неабходныя для гуманістычнага выхавання навучэнцаў. А тлумачэнне правоў і іх вывучэнне і з'яўляюцца зыходным момантам для фарміравання ў падлеткаў грамадзянскасці, дэмакратычнай культуры, сацыяльнай творчасці, умення дзейнічаць у інтарэсах самаўдасканалення сваёй асобы, грамадства, Айчыны. Улічваючы вялікі сацыяльна-педагагічны патэнцыял, закладзены ў Канвенцыі ААН і Законе "Аб правах дзіцяці", прапаганда гэтых дакументаў вядзецца сродкамі пазакласнай работы. Майстры, выхавацелі стараюцца выкарыстоўваць нетрадыцыйныя формы правядзення пазакласных мерапрыемстваў. Напрыклад, цікавы і змястоўны вусны часопіс майстра вытворчага навучання С.Паўлюковай "Тваё правы, выпускнік". Гэты матэрыял можна выкарыстоўваць і дарослым, і падлеткам.

У вучылішчы навучаюцца дзеці з поўных і няпоўных сем'яў, дзеці-сіроты, дзеці, якія маюць апекуноў. Таму кожнаму з іх важна ведаць свае правы, каб вызначыцца ў жыцці пасля атрымання прафесіі. Майстры вытворчага навучання Г.Асмалоўская і С.Салянікава для выхаваўчай гадзіны сумесна з навучэнцамі падрыхтавалі матэрыялы для правядзення брэйнг-рынга "Па старонках нашых правоў". Элементы спаборніцтваў, музычныя застаўкі, сітуацыі дапамагаюць падлеткам папаўняць свае веды ў галіне правоў чалавека, фарміраваць перакананні аб каштоўнасці ўласнай асобы.

У тыдні прававых ведаў прыме ўдзел метадычны праект тэматычнага вечара майстроў вытворчага навучання Е.Прасенцавай і С.Грынёвай "Кожнае дзіця мае права". Праграма разлічана не толькі на ўдзельнікаў, але і на гледачоў (а гэта, як правіла, моладзь горада). Гульні, экспрэс-конкурсы, разгадванне красвордаў у якасці дамашняга задання будуць садзейнічаць і пашырэнню прававога кругагляду, і карыснаму адпачынку.

Інтэлектуальную гульню "Правы чалавека — правы дзіцяці" пранаўюць групам першага курса майстры вытворчага навучання Г.Краўчанка і Л.Міранцава.

Гэта толькі асобныя штрыхі работы нашага педагагічнага калектыву ў даным, вельмі актуальным на сёння накірунку. Важныя не формы правядзення мерапрыемстваў, а вынікі, лічаць нашы педагогі.

У 1999 — 2000 навучальным годзе сацыяльны педагог Н.Марусеева падрыхтавала бацькоўскі сход "З павагай да будучыні". Сумесна з бацькамі педагогі разважалі над пытаннямі аб становішчы дзяцей у нашым грамадстве, аб выкананні бацькамі іх грамадзянскіх і бацькоўскіх абавязкаў і г.д. І сумесныя вывады пасля сходу — гэта яшчэ адзін крок наперад у далейшай агульнай рабоце па выхаванні падлеткаў. У гэтым навучальным годзе плануем правесці разам з бацькамі нашых навучэнцаў турнір-гульню "Вялікі сямейны перапынак" (метадычная распрацоўка майстроў вытворчага навучання С.Койнавай і А.Яфрэменка).

Нашым дзецям — жыць у цывілізаваным грамадстве, а значыць трэба мець прававую культуру. Яшчэ старажытныя рымляне гаварылі, што "права ёсць мастацтва дабра і справядлівасці".

С.БОРАХАВА,
намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце ПТВ № 130 Чэрыкава.

Новыя піянеры

Дэвіз: дабро, Радзіма, справядлівасць

У сярэдзіне 80-х гадоў наша адукацыя аказалася на пераломе дзвюх сацыяльных сістэм, кожная з якіх мела свой сацыяльны запас. Піянерская арганізацыя аказалася на задворках адукацыі. З усіх бакоў у яе адрас сыпаліся папрокі, не заўсёды апраўданая крытыка, якая і прывяла да развалу піянерскай арганізацыі. Спатрэбілася 15 гадоў, каб мы нарэшце зразумелі прапісную ісціну: разбураючы, мы новага не прапанавалі і не стварылі. Сапраўды, піянерская арганізацыя за доўгія гады свайго існавання набыла вялікую колькасць недахопаў: яна была ў значнай ступені ідэалагізаванай, работа ў ёй вялася нярэдка фармальна. Аднак структура гэтай арганізацыі вельмі неабходна сённяшняй сучаснай школе. Яна дае магчымасць арганізаваць, сістэматызаваць работу з вучнямі па маральным, прававым, этычным, патрыятычным, працоўным выхаванні, дае магчымасць падлеткам рэалізаваць свае магчымасці.

Лічу, што на сённяшні дзень ключ да поспеху ў выхаваўчай канцэпцыі школы ляжыць у піянерскай арганізацыі. Наша школа працуе ў рамках інавацыйнай канцэпцыі адаптыўнага навучання і выхавання вучняў. У новым навучальным годзе распрацаваны інавацыйныя комплексна-мэтавыя праграмы навучання і выхавання, у якіх прыкметную ролю адыгрывае піянерская арганізацыя. На ўвесь навучальны год распрацаваны план работы піянерскай дружыны "Праметэй".

Не сакрэт, што многія дзеці ў наш час засталіся без увагі, многія не могуць рэалізаваць сябе. Таму мы правялі апытанне сярод дзяцей і падлеткаў і прыйшлі да высновы, што трэба стварыць арганізацыю ў нашай школе, якая дасць магчымасць напоўніць інтарэсы дзяцей сацыяльна значным зместам, будзе рыхтаваць іх да жыцця і працы ў новых сацыяльна-эканамічных умовах.

Калі арганізацыя перастае быць фармальнай, мае дакладную і зразумелую праграму, у яе добраахвотна, з вялікім жаданнем ідуць дзеці. На сённяшні дзень піянерская дружына сярэдняй школы № 72 сталіцы — самая вялікая ў Партызанскім раёне, яна налічвае 80 чалавек. Быць піянерам у нашай школе — гэта сапраўды быць першым ва ўсіх справах. Піянерам зайздросцяць, на іх раўняюцца.

У планах нашай школы — адкрыццё музея баявой славы. Дзеці ўжо прыносяць экспанаты. У школе прыступілі да распрацоўкі праекта "Зямля — наш дом", у якім вялікае месца адводзіцца піянерскай арганізацыі. Аднак работа піянерскай арганізацыі немагчыма без матэрыяльнай і духоўнай падтрымкі.

Асноўныя паняцці, якія закладзены ў прынцыпы піянерскай арганізацыі, — справа, дабро, Радзіма, справядлівасць. Мы прыкладваем усе намаганні, каб дапамагчы кожнаму піянеру стаць сапраўдным грамадзянінам, сваімі справамі і ўчынкамі прыносіць карысць сабе, сям'і, Бацькаўшчыне.

Вучні нашай школы ўступаюць у арганізацыю добраахвотна, з вялікім жаданнем. Але спачатку яны праходзяць розныя іспыты. Так, першая група падлеткаў узяла шэфства над ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, якія жывуць у нашым мікрараёне. Яны пастаянна наведваюць ветэранаў, дапамагаюць ім па гаспадарцы, віншуюць са святамі. Падлеткі ўстанавілі сувязь з удзельнікамі падполля, якое дзейнічала ў Рагачоўскім раёне. Піянеры збіраюць розны матэрыял, запісваюць расказы пра баявыя дзеянні гэтага падпольнага атрада для таго, каб стварыць свой музей. У нашых планах — наладзіць супрацоўніцтва з музеем у горадзе Рагачове, з'ездзіць на экскурсію ў мясціны, дзе праходзілі падзеі таго часу.

Для таго каб больш ведаць пра свой край, мы ходзім у паходы. Нядаўна зрабілі паход у мястэчка Вязынка, наведалі музей Янкі Купалы, пазнаёміліся з побытам беларусаў і ўмовамі, у якіх жыў паэт. На прывале піянеры выбралі для сябе пэўны ўчастак лесу для таго, каб ачысціць яго ад смецця. Прычым наладзілі спаборніцтвы паміж атрадамі, хто зробіць гэта больш якасна. Пасля дзеці гулялі ў футбол, у іншыя спартыўныя гульні, пяклі бульбу, спявалі песні, расказвалі розныя гісторыі, жартавалі. З паходу вярталіся з узнятым настроем.

Піянеры выказалі жаданне павіншаваць дзяцей-інвалідаў са спецінтэрната з навагоднімі святамі. Яны падрыхтавалі і падарункі для гэтых дзяцей.

Піянеры не толькі самі добра вучацца, але і ўзялі шэфства над непаспяваючымі вучнямі, дапамагаюць ім пераадольваць цяжкасці ў вучобе.

У нашай дружыне створаны атрад юных інспектараў руху. Члены гэтага атрада вядуць растлумачальную работу сярод малодшых школьнікаў па правілах дарожнага руху, дзяжурыць на скрыжаваннях. Рэдкалегія піянерскай дружыны пастаянна выпускае насценгазеты, прысвечаныя розным святам.

Не забываем мы і пра адпачынак: наладжваем вечары адпачынку, на якіх праводзяцца конкурсы, гульні.

Мы вельмі хочам наладзіць сувязь з піянерскімі атрадамі нашай Беларусі, а таксама Расіі і іншых краін. Пішыце нам па адрасе: г.Мінск, вул.Халмагорская, д.59, сярэдняя школа № 72, Куляшовай Алене Мікалаеўне.

Алена КУЛЯШОВА,
настаўніца, кіраўнік піянерскай арганізацыі сярэдняй школы № 72 Мінска.

Падпісацца на "Настаўніцкую газету" можна ў любым паштовым аддзяленні ці ў агенцтве "Белсаюздруку".
Падпісны кошт на квартал для індывідуальных падпісчыкаў — 1440 рублёў.

Весткі з сярэдняй школы № 13 Мазыра

У спорце — першыя

У нашане тут спорт. У спартыўнай зале вучні маюць магчымасць адначасова займацца валейболам і баскетболам. Добра абсталявана футбольнае поле. Школа набыла дастаткова валейбольных, футбольных, баскетбольных мячоў і іншага інвентару. Ёсць два наборы гульні ў хакей. Гэтым відам спорту адначасова могуць займацца дзесяць чалавек.

Добрых вынікаў дабіваецца настаўнік фізкультуры вышэйшай катэгорыі Аляксандр Міхайлавіч Ніціфараў. Валейбольная каманда дзяўчынак ужо некалькі гадоў запар займае першае месца сярод школ горада і прызавое — у вобласці. Першынство ў горадзе па баскетболе трымае каманда хлопчыкаў, дзе трэнерам працуе А.В.Гдзюка. Аляксандр Васільевіч — настаўнік вышэйшай катэгорыі.

Вучні гэтай навучальнай установы трымаюць першынство сярод школ горада па лёгкай атлетыцы, кросе, турызме.

Многія з іх вырашылі звязаць свой лёс са спортам. За апошнія два гады на аддзяленні фізвыхавання ў навучальныя ўстановы паступілі 13 выпускнікоў школы.

Басейн працуе круглы год

Плавальны школьны басейн працуе на працягу ўсяго года. Яго наведваюць хлопчыкі і дзяўчынкі нулявога, а таксама 1 — 5 класаў.

Трэнеры сочаць за тым, каб пазбегнуць скрыўлення пазваночніка, добра ўмацаваць мышцы спіны. Як правіла, вучні менш хварэюць. Ў гэтым вялікая заслуга трэнера па плаванні Анатоля Дашкевіча. За станам здароўя дзяцей сочыць таксама медсястра Марына Васенда.

У басейне ёсць медыцынскі пакой, раздзявалка. Яго штодзённа наведвае 800 вучняў.

Грамата — школьнай сталовай

Школьная сталовая з'яўляецца адной з лепшых у вобласці. За якаснае прыгатаванне ежы, належнае абслугоўванне вучняў летась яе калектыву ўручана грамата ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама.

У сталовай праце 12 чалавек. Калектыў узначальвае Г.П.Туравец. Галіна Пятроўна — высокакваліфікаваны спецыяліст, пастаянна сочыць за захаваннем санітарыі, якасным прыгатаваннем стравы, разнастайнасцю меню.

У меню заўсёды ёсць соки, цытрусавыя, салаты, мясныя і рыбныя стравы. На кожнага вучня дзяржава выдзяляе не менш чым 900 рублёў. Вучняў з нулявых класаў кормяць тры разы ў дзень, і на кожнага з іх выдзяляецца ў сярэднім па 1600 рублёў.

Дзякуй, шэфы!

Без іх сёння школе ў гэты складаны час існаваць было б вельмі цяжка. Да шэфаў дырэкцыя звяртаецца з рознымі просьбамі.

Так, домабудаўнічыя камбінаты №№ 1 і 2 дапамагаюць цэментам, крэйдай. З іх дапамагой праводзіцца рамонт дзвярэй, сталоў, парт. Хочацца выказаць шчырыя словы ўдзячнасці адміністрацыі "Мазырнафтапастаўкі" за чуласць і ўвагу да школы. Цесную сувязь з ёй трымае дырэктар ПМК-105 Валянцін Фёдаравіч Пісанік.

Аляксандр ГРУШЭЦКІ,
настаўнік гісторыі сярэдняй школы № 11 Мазыра.

Здароўе дзяцей — здароўе нацыі

Каб кожны дзень пачыналі з радасцю, а заканчвалі – мірам

Вынадкі ў практыцы псіхолага санаторнай школы-інтэрната, як і любой дзіцячай установы, бываюць самыя розныя. Доўгае перажыванне хворым падлеткам, напрыклад, свайго фізічнага дэфекту абавязкова вядзе да развіцця неўрозу, хваравітай ранімасці, празмернай узбуджальнасці, афектаў, фобій. Таму школьны псіхолаг павінен своечасова аказваць падлеткам псіхалагічную дапамогу, якая ім вельмі патрэбна.

З розных ідэй і гіпотэз

У нашай санаторнай школе-інтэрнаце ажыццяўляецца комплексны падыход да лячэння дзяцей, іх аздараўлення з выкарыстаннем медыцынскіх, выхаваўчых, псіхалагічных мерапрыемстваў лячэбнай, псіхалагічнай і карэкцыйнай накіраванасці. Сацыяльна-псіхалагічная адаптацыя нашых вучняў ажыццяўляецца на розных узроўнях: арганізацыйным, на ўзроўні класа, невялікай групы, асобасным. Дзяцей у нашай школе 149. Гэта 149 індывідуальнасцей. Хваробы страўніка, на якія пакутуе абсалютная большасць нашых вучняў, уплываюць на іх пазнавальную сферу, інтэлект, асаблівасці асобы.

Абследаванне, праведзенае ў нашай школе, паказала, што на фоне хранічнага захворвання страўніка даволі частыя асобасныя змены: перш за ўсё зніжэнне інтэлектуальных здольнасцей, эмацыянальная дэзарганізацыя мыслення, пэўная разумовая непаўнацэннасць. Адны дзеці ўзбуджаны, напружаны, раздражнёны, падвержаны эмацыянальным успышкам, іх інтарэсы зменлівыя, яны вельмі стамляюцца, у школе іх завуць "псіхамі". Другія замкнёныя, вялыя і безуважныя. Падлеткі-"псіхі" пры любой несправядлівасці і крыўдзе лаюцца, льюць слёзы, нярэдка б'юцца жорстка і бессэнсоўна, часцей гэта бывае з хлопчыкамі, але бывае і ў дзяўчынак (узрост 7-га класа). Безумоўна, гэта выклікаецца не толькі хваробай, але і неспрыяльнай дамашняй абстаноўкай, агрэсіўнымі паводзінамі бацькоў, набоямі. У многіх дзяцей ярка праяўляецца астэнія, а на яе фоне — зніжэнне ўстойлівасці канцэнтрацыі, аслабленасць адвольнай увагі. Нашы хворыя падлеткі часта скардзяцца на дрэнную памяць. Канешне, пажадана, каб настаўнікі ў час урокаў пастаянна помнілі пра тое, што многія дзеці — сур'ёзна хворыя.

Як аказаць кваліфікаваную дапамогу падлеткам з асаблівасцямі фізічнага і саматычнага развіцця? Адказ на гэтае пытанне шукаюць і знаходзяць практычныя псіхолагі. На пачатку навучальнага года, калі ў школу прыходзяць новыя дзеці, яны пішуць сачыненне "Мая хвароба" ці пісьмо ў адрас свайго хворага страўніка, малююць сваю хваробу ці пачуцці, звязаныя з ёй, складаюць апавяданне ад імя сваёй хваробы і г.д. Паралельна праводзіцца фантазія "Ружовы куст", архетыпы "Вада", "Зямля", "Агонь", "Сонца" па методыцы Дж. Алана, якія адразу дапамагаюць псіхолагу вылучыць падлеткаў, якім асабліва востра патрэбна першачарговая псіхалагічная дапамога.

Псіхолаг абавязкова працуе ў цеснай узаемасувязі са школьнымі ўрачамі і медсёстрамі, знаёміцца з дыягназамі захворванняў, звяртае ўвагу на адпаведнасць фізічнага развіцця ўзросту: рост, вага, зрок, слых, асанка і г.д. Праводзяцца пастаяннае назіранне за паводзінамі падлетка, гутаркі з яго бацькамі. Псіхолаг мае анамнестычныя звесткі на кожнага падлетка (у нашым выпадку 4 — 9 класы). Ён сочыць, як уплываюць фізічныя і саматычныя асаблівасці вучня на развіццё яго асобы, у чым і як гэта праяўляецца. Калі ўплыў негатыўны ці існуе магчымасць карэкцыі, урач ставіць дыягназ, паведамляе, якімі захворваннямі, магчыма, ускладнена спадчыннасць і дае свой прагноз развіцця хваробы. Псіхолаг выпрацоўвае свой мяркуемы псіхалагічны дыягназ, які павінен змяшчаць прагноз на будучае, калі будзе ці не будзе карэкцыі. І фармулюе магчымыя гіпотэзы.

Сутнасць дыягностычнага заключэння — у фарміраванні розных ідэй і гіпотэз, якія датычаць праблем гэтага дзіцяці, прычын, што садзейнічаюць захаванню праблемы, і найбольш эфектыўных спосабаў карэкцыі. Вывучаюцца знешнія сіндромы паводзін. Калі неабходна дапамога парапсіхолага ці дэфектолага, то падлетак у тактоўнай форме накіроўваецца да спецыяліста. Псіхолаг можа правесці глыбокае псіхалагічнае абследаванне падлетка, якое ўключае ў сябе дыягностыку па розных відах дзейнасці, дэталёва вывучаецца перадгісторыя кансультуемага выпадку. Кансультацыі могуць быць аднаразовымі і шматразовымі. Гэта могуць быць гутаркі. Мэтай дыягностыкі можа быць выпрацоўка неабходных практычных рэкамендацый для настаўнікаў і выхавацеляў, якія працуюць з падлеткамі з асаблівасцямі фізічнага і саматычнага развіцця.

Псіхалагічны дыягназ не павінен кампраметаваць дзіця, гэта значыць псіхолаг павінен прытрымлівацца этычных нормаў і прынцыпаў у сваёй працы. У кожным канкрэтным выпадку псіхолаг павінен улічваць канкрэтныя абставіны абследавання, іх уплыў на вынікі і супастаўленне іх з нарматывамі. Так, псіхолаг мае справу з унікальнай сітуацыяй, калі ў рэальнай жыццёвай сітуацыі неабходна прымяніць абгрунтаванае дыягнастычнае абследаванне. Часта бывае, што падлетак прыйшоў з адной праблемай, а аказваецца — іншая.

"Вось я вырашыла, што я — вар'ятка"

Першы выпадак. Да псіхолага па рэкамендацыі ўрача школы на кансультацыю прыйшла дзяўчынка Ніна У., пяцікласніца 11 гадоў. Дзяўчынка сфармулявала сваю праблему наступным чынам: "Мама сказала, што ў мяне неўроз, ёй так урач сказаў. Вось я і вырашыла, што я — вар'ятка". Расплакалася. Першапачатковая гіпотэза была такая: павышаная трывожнасць і высокая ступень эмацыянальнай лабільнасці. Быў выкарыстаны мадыфікаваны колеравы тэст Люшэра, які паказаў наяўнасць сур'ёзных унутраных канфліктаў, уздзеянне працяглага стрэсу і г.д.

Ніначка скардзілася на галаўныя болі, болі ў спіне і жывоце — відавочныя прыкметы стрэсавага напружання. І паведаміла, што ёй уяўляюцца чырвоныя плямы на столі, сценах. Псіхолаг прапанавала намаляваць гэтыя плямы. Абрысы выразна нагадвалі мужчыну з нажом, які нахіліўся да жанчыны і замахнуўся для ўдару. Далейшыя кансультацыі прыводзілі да новых адкрыццяў: пасля правядзення накіраванай візуалізацыі "Ружовы куст" узнікла яшчэ адна гіпотэза — магчымасць сексуальнага гвалту. Пасля гутаркі і правядзення кінетычнага малюнка сям'і было высветлена, што сваяк дзяўчынкі, пажылы мужчына, іншаземец, разбэшчваў дзяўчынку падчас яе паездак з маці да яго ў госці. Дзяўчынка гаварыла псіхолагу, што ёй "хочацца зняць з сябе скуру, я быццам уся ў грязі". Ніначка прасіла не гаварыць пра гэта маці. Аднак псіхолаг вырашыла, што сітуацыя мае пагрозу для псіхікі і здароўя дзяўчынкі, сустрэлася з маці дзіцяці. У ходзе гутаркі з ёй псіхолаг выказала меркаванне, што, магчыма, дзяўчынцы пагражае сексуальны гвалт, нібыта гэта відаць па малюнкавых тэстах. Маці адразу зразумела, што гэта магчыма з боку іх сваяка. Яна пабянцала, што больш дачку за мяжу не возьме і будзе да яе ўважлівай.

Дзяўчынка прыходзіла да псіхолага адзінаццаць разоў. У ходзе кансультацый выкарыстоўваліся накіраваныя фантазіі, візуалізацыя. Ніначка засвоіла эфектыўныя прыёмы рэлаксацыі. Вынікі былі станоўчымі. У дзяўчынкі спынілася галаўная, страўнікавыя болі. Нармалізаваўся эмацыянальны стан. Ёй было прапанавана ў парадку выключэння застацца ў інтэрнаце яшчэ на адзін год, каб замацаваць добрыя перамены ў складаным унутраным свеце.

"Аказваецца, я нармальны чалавек"

Другі выпадак. Да псіхолага звярнуўся вучань 9-га класа 15-гадовы Дзіма П. з медыцынскім дыягназам "гастрадуадэніт". Ён страціў апетыт, і ўрач, западозрыўшы магчымасць псіхалагічнай праблемы, прыслала яго да псіхолага. Падлетак вельмі нерваваўся, сказаў, што хоча забіць свайго бацьку, разумеючы, што гэта злачынства, але баіцца не вытрымаць. Падчас першай кансультацыі было высветлена, што бацька пастаянна піў, біў маці, якая з-за гэтага перыядычна трапляла ў бальніцу.

Аднойчы бацька вырашыў узарваць увесь дом, адкрыў краны газавай пліты і стаў з запалкамі ў руках ля парога. Суседзі выклікалі міліцыю, але самі не адважваліся падысці. Тады малодшы брат Дзімы падышоў да бацькі і сяк-так, падманам забраў запалкі. Бацьку пасадзілі ў турму. Адтуль ён піша дадому лісты, поўныя любві. Хоча вярнуцца да іх, засталося тры месяцы да яго вызвалення. Маці вагаецца, а Дзіма яго ненавідзіць.

Хлапчуку была аказана пэўная псіхалагічная дапамога: прапрацаваны сцэнарны апытальнік Берна. Любімая казка падлетка — "Чырвоная Шапачка". Цікава, што сябе ён лічыў паляўнічым, а бацьку — ваўком. Але потым сказаў, што і любімы адмоўны персанаж у яго — таксама воўк, таму што ён дужы, смелы і хітры! Гэта значыць ён не толькі ненавідзіць, але і захапляецца бацькам. Былі выкарыстаны юнгіянскі падыход, методыка Алана і інш. Сярод сваякоў быў знойдзены пазітыўны персанаж для пераймання.

Выкарыстоўвалася праектыўнае маляванне архетыпаў "сонца, зямлі, вады і агню". Гэта вельмі дапамагло падлетку. Была адпрацавана ніжэйшая ступень аўтагеннай трэніроўкі паводле метаду Шульца. Падчас кансультацый Дзіма навучыўся базавым сацыяльным уменням. Напрыклад, як адказваць на правакацыю іншых, не трапляючы ў праблемную сітуацыю. Сумесна з псіхолагам праблемы хлапчука былі вырашаны. Ён паехаў вучыцца ў іншы горад, вызначыўся, як паводзіць сябе нават у непрадказальнай сітуацыі, адзначыў паляпшэнне самаадчування. Псіхолаг старалася назіраць за падлеткам, трымала з ім сувязь, калі ён паехаў.

Пасля гэтага прайшоў год. Нядаўна псіхолаг даведалася, што ў яго ўсё ў парадку. Ён вучыцца, маці з бацькам развяліся, таму што гэта было для маці адзінае выйсце. Калі падлетак пакідаў інтэрнат, ён зайшоў да школьнага псіхолага развітацца і сказаў: "Я думаў, што я — псіх, а аказваецца, я нармальны чалавек, дзякуй". Псіхолаг пажадала Дзіму мужнасці.

Такім чынам, воля псіхолага як бы перадаецца падлетку і дае яму зарад для працы над сабой. Падчас "споведзі" і псіхолаг, і падлетак былі настроены на песімістычны лад, а на стадыі тлумачэння выпрацоўвалася новая мадэль паводзін, і замест адчаю ў Дзімы паявілася мужнасць... Псіхолаг пераканалася, што галоўнае ў кансультаванні — гэта шчырая эмпатыя да кліента, таму што падлеткі хутка адчуваюць фальш.

"Маёй маме на мяне напляваць"

Часта псіхолаг працуе з дзіцем і не мае магчымасці далучыць да гэтага працэсу яго сям'ю. Асабліва складана з праблемнай сям'ёй, дзе падлетак з'яўляецца "казлом адпушчэння". Бацькі звычайна бачаць у ім першапрычыну ўсіх сваіх бед. Для такога дзіцяці асабліва важны кантакт з псіхолагам, гэта значыць з чалавекам, які паважае яго і бачыць у ім асобу, якая мае права на незалежнае развіццё.

Калі сям'я вельмі неарганізаваная, трывожная і ў ёй няма згоды, то першыя заняткі праводзяцца толькі з падлеткам. Напрыклад, бабуля цягне дзіця ў царкву, маці патрабуе добрых адзнак, кожны дзень бегае ў школу і плача, а бацька перыядычна б'е. У выніку дзіця збягае ў іншы горад. Толькі са згоды дзіцяці запрашаю ў школу членаў сям'і, аднойчы гэта была нават прабабуля. Агульныя заняткі з сям'ёй паказваюць, дзе адбываецца "збой". Напрыклад, дзіця скардзіцца: "Дядуля не дазваляе мне з ім нічога майстраваць". Псіхолаг канкрэтызуе, чым дзіця хоча займацца з дзядулем, што ў дзіцяці раздражняе дзядулю. Ці маці кажа: "Ён усё робіць мне на злость". — "Калі ласка, падрабязней, што значыць "на злость"?"

Псіхолаг павінен сачыць, каб гаворка не "расплывалася", а была сканцэнтравана на праблеме. Узаеміны падчас кансультацыі — гэта не толькі прыемнае буркаванне, якое прыносіць задавальненне, яны могуць несці гора і прыкрасць, гнеў і трывогу. Да гэтага трэба быць гатовым. Напрыклад, дзіця кажа: "Маёй маме на мяне напляваць. Яна нават не ведае, што я так люблю музыку і хачу іграць на гітары, а ў яе толькі кірмашы і гандаль у галаве". Мама гаворыць: "А адкуль я пра яго буду ведаць? Яму добра з сябрамі, навошта яму яшчэ нейкая гітара?" Гэта значыць, яна зусім нічога не ведае пра інтарэсы сына. Многія бацькі настолькі атаясамліваюць сябе з падлеткам, што не разумеюць, што ён асобны чалавек. Напрыклад, адна мама ўшчувае дзяўчынку Алесю за тое, што яна плаксівае дзіця (дзіця вельмі чуллівае, з высокай ступенню лабільнасці). Калі маці была дзяўчынкай, яе мама крычала на яе за тое, што яна плакала, і тая яе ненавідзела. У такія моманты яна была як бы і яе маці, і дзіця адначасова.

Усвядоміўшы гэта ў працэсе кансультацыі, маці стала паводзіць сябе больш асцярожна ў адносінах да дачкі. Часам бацькі перажываюць, што дзіця тоўстае, дрэнна бачыць, а дзіця зусім не так моцна перажывае адносна гэтага. Атрымліваецца, што ў маці праблемы з адаптацыяй. Бацькі страшэнна здзіўляюцца, калі раптам разумеюць, што іх дзіця — гэта самастойная асоба са сваімі ўласнымі жаданнямі, пачуццямі.

Мне як псіхолагу блізкія словы У.Леві: "Жадаю, каб кожны дзень разам з дзіцем вы пачыналі з радасцю, а заканчвалі — мірам". З улікам таго, што дарослыя могуць будаваць больш канструктыўныя ўзаеміны са сваімі дзецьмі, калі будуць ведаць іх узроставыя асаблівасці і праблемы, распрацаваны курс бацькоўскіх сустрэч "Сакрэты цёплага дома". Іх місія — стварыць умовы для неабходных канструктыўных змен бацькоў і падлеткаў з асаблівасцямі фізічнага і саматычнага развіцця. Пажадана, каб бацькі засвоілі формулу паспяховага выхавання: строгасць + ласкавала - раздражненне.

Часцей згадваць сябе ў дзяцінстве...

Колькі слоў пра работу псіхолага з педагогамі. Праводзіцца гадавы цыкл заняткаў, які прадугледжвае навучанне прыёмам псіхалагічнай карэкцыі няправільных педагагічных установак. Плюс развіццё эмпатыі (паводле Харына і Самавукінай). Пастаянна распрацоўваюцца рэкамендацыі псіхолага для працы настаўнікаў і выхавацеляў з падлеткамі, якія маюць асаблівасці фізічнага і саматычнага развіцця.

Такім чынам, напрошваецца выснова, што пры лячэнні хранічных хвароб (у нашым выпадку СКТ) толькі медыкаментознае лячэнне рэдка прыводзіць да поўнага вылечвання. Калі застаецца эмацыянальны стрэс ад існуючых праблем, то падлетак, безумоўна, атрымае рэцыдыў. Для таго каб дабіцца стабільнага выздараўлення ці працяглага паляпшэння, павінны быць ліквідаваны ці хоць бы зменшаны пастаянныя раздражняльнікі як вынік канфліктных сітуацый, якія правакуюць стрэсы і дыстрэсы. Толькі ў цесным прафесійным супрацоўніцтве і пастаянным кантакце псіхолага з медыцынскімі работнікамі, педагогамі і бацькамі пры поўнай павазе адзін да аднаго можна дамагчыся ўстойлівага паляпшэння здароўя вучняў.

Кожны псіхолаг ведае мноства гісторый, і сумных, і вясёлых, і разумее, што ўсе дзеці патрабуюць увагі. Але заўсёды ёсць і "самыя-самыя". Заўсёды трэба памятаць, што работа з дзіцем — гэта працэс, які вымагае далікатнасці і асцярожнасці. Проста трэба часцей згадваць сябе ў дзяцінстве. Цвёрда ўпэўнена, што кожнае дзіця унікальнае і з'яўляецца паўнапраўнай асобай, але асобай тонкай, ранімай, якой патрэбен дарослы разумны саюзнік, дарадца. І такімі саюзнікамі для дзяцей становімся мы, псіхолагі.

Людміла КАНДРАЦЬЕВА,
педагог-псіхолог Слонімскай санаторнай школы-інтэрната, суіскальнік кафедры псіхалогіі Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі.

Тут гартуюцца вайскоўцы

Вось якія яны, дванаццацігадовыя мужчыны!

— Сяргейка, а ты "Нязнайку на Месяцы" глядзеў? Кажуць, па тэлеку паказвалі... — фыркаючы ля ўмывальніка, спытаў хлапчук у таварыша, які стаяў побач.

— Мне бацькі гэты мульцік яшчэ летась на дзень нараджэння падарылі, — не без гордасці адказаў сусед.

Афіцэр, які з'явіўся ў праёме дзвярэй, незадаволена паморшчыўся:

— А вы што тут робіце? На заняткі хочаце спазніцца? Марш на пастраенне!

Выціраючыся на ходу ручнікамі, хлапчукі прашмыгнулі міма ротнага і, тупаючы чаравікамі па паркеце доўгага калідора, набеглі ў размяшчэнне свайго ўзвода, дзе іх сустрэлі дружным смехам суворыя. Заўважыўшы струйку вады, што цякла ва ўмывальнік, афіцэр закрыў кран і, пакруціўшы галавой, усміхнуўся: "Ну, галчаняты..."

Пунсовыя пагоны ў гарадскім тлуме відаць здалёк. А калі росту ў іх уладальнікаў, як кажуць у народзе, "ад гаршка паўвяршка" (няхай даруюць мне некаторыя малышы-першакурснікі), то ўвага прахожых забяспечана. Нехта глядзіць услед з любоўю, нехта — са шчырым здзіўленнем. Але цікаўнасць у позірках як у тых, так і ў другіх.

Ужо некалькі гадоў у Мінскае суворыўскае ваеннае вучылішча набіраюць падлеткаў пасля пятага класа сярэдняй школы. Жадаючых надзець пунсовыя пагоны — хоць адбаўляй. Ці можна ў адзінаццаць-дванаццаць гадоў зрабіць свой жыццёвы выбар? Псіхолагі сумняваюцца. Бывалі выпадкі, калі, вытрымаўшы ўсе іспыты пры паступленні ў прэстыжную навучальную ўстанову, хлапчукі ламаліся і пакідалі вучылішча, не правучыўшыся і некалькіх месяцаў. Мінскае СВВ — ужо далёка не школа. Жыццё па распарадку, фізічныя нагрузкі, напружаная вучоба — гэта яшчэ не поўны пералік цяжкасцей, якія даводзіцца пераадольваць падліткам. Але найбольш цяжка ім псіхалагічна. На першым часе вучоба ў сценах суворыўскага для многіх хлапчукоў нагадвае гульню ў вайну. Праз колькі тыдняў прыходзіць разуменне, што родныя і блізкія хоць і прыходзяць пакуль дапамагаць на самападрыхтоўцы грызці граніт навукі, аднак яны ўжо далёка. І жыць у вучылішчы трэба па мужчынскіх законах. Нават калі ад роду табе дванаццаць гадоў.

У першыя месяцы вучобы падушкі многіх малышоў-першакурснікаў мокрыя ад слёз. Такая праўда.

— І гэта нармальна, — сцвярджае старшы памочнік начальніка вучэбнага аддзела па прафесійна-псіхалагічным адборы Жанна Казачонак. — Натуральная дзіцячая рэакцыя. Плачуць жа не таму, што ў вучылішчы нейкія невыносныя ўмовы. Ад мамы з татам дзіця адарвалі, а тут даводзіцца прывыкаць да такіх слоў, як "загад", "старшы па званні".

Перыяд адаптацыі лягчэй перажываюць тыя, хто зрабіў свой выбар самастойна. Суворыўца Аляксея Жыбулева, напрыклад, маці адгаворвала ад "непатрэбнай" задумы, ды марна. Пра выбар свой хлапчук не пашкадаваў. Суворавец Дзяніс Загорскі ў свой час міма СВВ на трэніроўкі па самба ездзіў. Форма суворыўская спадабалася. Вырашыў з сябрамі паспрабаваць шчасця пры паступленні. Удача ўсміхнулася толькі яму аднаму.

Дарэчы, вучацца ў вучылішчы нават хлапчукі, якія да паступлення ў Мінскае суворыўскае і ў горадзе вялікім не бывалі, тралейбусаў іначш як па тэлевізары не бачылі.

Падлеткам з сельскай мясцовасці на занятках, як правіла, цяжкі, чым гарадскім, — праяўляецца розніца ва ўзроўні падрыхтоўкі. Але педагогі ўпэўнены — у такім узросце можна навучыць рашаць задачы на працэнты і дробы. За час вучобы ў Мінскім суворыўскім можна паспяхова засвоіць правілы рускай і беларускай моў. Важна іншае, тое, што па пяцібальнай шкале не ацэньваецца, — навучыць хлапчука чалавекам быць!

Многія афіцэры-выхавацелі сцвярджаюць, што з малышамі працаваць цікавей. Чаму — не зразумела я, калі пачула гэта ўпершыню. Сказалі б, маўляў, больш клопату з першакурснікамі. Бо караць іх пакуль нельга — хіба што праз бацькоў узлезлічаць. На занятках ў першы час таксама абавязкова з імі трэба хадзіць, за партамі разам сядзець... Ды і служба нейкая непаўнацэнная ў малышоў гэтых: нарад па роце толькі днём свае абавязкі выконвае, а ноччу ў ложках пасціца. І ў звальненні кожны першакурснік адпачыць павінен.

Аказваецца, прываблівае афіцэраў у малышах іх адкрытасць. Да прыкладу, яны шчыра радуюцца дням нараджэння сваіх таварышаў, а прынесеныя бацькамі тарты дзеляць пароўну на ўсіх. І не варта здзіўляцца, калі пасля каманды "адбой" у тапках на босую нагу падыдзе да камандзіра хлапчанё і папросіць дазволу пачытаць у класе схаванага падпахай "Чараўніка Ізумруднага горада"...

Святлана МАКАРАВА.

Падзялюся з вамі

Політэхнічная акадэмія ў люстэрку конкурсаў

Беларуская дзяржаўная політэхнічная акадэмія — не толькі буйнейшая інжынерна-тэхнічная ВНУ краіны, але і актыўны стваральнік інтэлектуальнай уласнасці. Так, напрыклад, у 1999 годзе выдадзена 29 манаграфій (у 1998 годзе — 15, у 1997 — 14), 19 падручнікаў (у 1998 — 10, у 1997 — 2), 1147 навуковых публікацый (у 1998 — 811, у 1997 — 970), напісаных супрацоўнікамі БДПА. Гэтыя даныя, самі па сабе характарызуючы вялікі аб'ём стваральнага навуковага прадукта, дэманструюць і відавочную тэндэнцыю актывізацыі гэтай дзейнасці.

Што да стварэння аб'ектаў прамысловай уласнасці і іх абароны, тут таксама назіраецца прыкметная тэндэнцыя да ўзрастання. Так, ад БДПА ў 1999 годзе было пададзена 57 заявак у Дзяржаўны патэнтны камітэт, у тым ліку 47 заявак на выдачу патэнтаў на вынаходствы і — упершыню — 10 заявак на выдачу карысных мадэляў. Пры гэтым 47 заявак на выдачу патэнтаў на вынаходствы склалі 19,83 працэнта (прыкладна адну пятую) заявак ад ВНУ Міністэрства адукацыі і 3,95 працэнта ўсіх заявак, што паступілі ў Белдзяржпатэнт у 1999 годзе.

Паводле вынікаў вынаходніцкай дзейнасці 1999 года сярод ВНУ Міністэрства адукацыі БДПА заняла першае месца.

Адзначаецца таксама павышэнне вынаходніцкай актыўнасці аспірантаў і студэнтаў. У 1999 годзе, напрыклад, да вынаходніцкай творчасці далучыліся 11 аспірантаў і 8 студэнтаў, у 1998 — 10 аспірантаў і 8 студэнтаў, у 1997 — 4 аспіранты. У першым паўгоддзі 2000 года сярод аўтараў дваццаці сямі заявак на вынаходствы — 2 аспіранты і 11 студэнтаў.

Падобная статыстыка абнадзейвае, бо існуе цесная сувязь паміж узроўнем патэнтавання вынаходстваў і эканамічным патэнцыялам краіны.

Відавочна, што сярод мерапрыемстваў, прымеркаваных да 80-годдзя нашай акадэміі, не апошнюю ролю адыгралі конкурсы навукова-тэхнічнай творчасці, праведзеныя навукова-даследчымі часткай БДПА. У адпаведнасці з праграмай мерапрыемстваў, прысвечаных 80-годдзю акадэміі, былі распрацаваны палажэнні аб гэтых конкурсах і створаны камісіі па падвядзенні вынікаў, якія і завяршылі сваю работу ў перад'юбілейныя дні.

У Палажэнні аб конкурсе на лепшую навукова-даследчую работу (конкурс манаграфій) былі сфармуляваны наступныя асноўныя ацэначныя крытэрыі: навізна, значнасць для навукі і практыкі, актуальнасць. На аснове ацэначных шкал, рэкамендуемых Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях і Міністэрствам адукацыі Беларусі, былі распрацаваны 4 віды рэкамендацыйных шкал: для фундаментальных і прыкладных даследаванняў; для даследаванняў у галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук і для даследаванняў у галіне грамадскіх навук. Першасная ацэнка рэкамендуемых на конкурс магаграфій праводзілася на факультэтах і агульнаакадэмічных кафедрах. Прымаліся да разгляду манаграфіі, выдадзеныя ў перыяд з 1996 года. Канчатковую ацэнку праводзіла камісія па падвядзенні вынікаў у складзе намесніка прарэктара па навуковай рабоце, вучонага сакратара навукова-даследчага сектара, прадстаўніка факультэтаў і загадчыка патэнтна-інфармацыйнага аддзела БДПА.

Канчатковае рашэнне прымалася не проста: большасць прадстаўленых на конкурс манаграфій заслужана характарызаваліся самымі высокімі значэннямі ўсіх паказчыкаў. Як бы то ні было, вынікі конкурсу падведзены. Пераможцам стаў аўтарскі калектыў у складзе Н.В.Богдана, А.І.Сафронава і Ю.Е.Атаманава за цыкл выдадзеных у 1997 — 1999 гг. манаграфій, прысвечаных канструяванню, устройству і тэхнічнаму абслугоўванню тралейбусаў, перспектывам развіцця гэтага віду транспарту. Другое месца заняла кніга Б.І.Гусакова "Эканамічная эфектыўнасць інвестыцый уласніка" (яе актуальнасць не патрабуе каментарыяў). Трэцяе месца — у манаграфіі Б.А.Багатава і І.В.Касарэвіч "Кампазіцыйныя матэрыялы: ідэя і практыка утылізацыі кустабалітаў".

Што да конкурсу на лепшае ўкаранёнае вынаходства, то згодна з Палажэннем аб конкурсе ў ім удзельнічалі вынаходствы, укаранёныя ў перыяд 1996 — 2000 гг. Пры падвядзенні вынікаў браўся пад увагу ўзровень дасягнутага станоўчага эфекту, аб'ём выкарыстання вынаходства ў вытворчасці, узровень складанасці вырашанай тэхнічнай задачы і велічыня эканамічнага эфекту, дасягнутага за кошт укаранення.

Патрэбна сказаць, што пры падвядзенні вынікаў гэтага конкурсу камісія не адчувала ніякіх цяжкасцей. Прымяненне названых крытэрыяў поўнасцю выключала магчымы суб'ектывізм ці розныя падыходы да ацэнкі, паколькі гэтыя крытэрыі былі вычарпальна дакладна сфармуляваны яшчэ ў вынаходніцкім праве СССР, а іх прымяненне было праверана практыкай дзесяцігоддзяў. Таму ўжо на сваім першым пасяджэнні камісія вызначыла пераможцаў. Імі сталі: В.А.Кароль і А.В.Сцепаненка (вынаходства "Устройства і метады для сінхроннай апрацоўкі супрацьлеглых канцоў аўтамабільнай ліставой рэсоры" — патэнт ЗША № 5001918, паводле якога дзейнічае ліцэнзійнае пагадненне з амерыканскай фірмай "Іган карпарэйшн") — першае месца; Н.В.Богдан і А.С.Павароха (вынаходства "Устройства для выпрабавання вільгацеаддзяляльнікаў рэгулятараў ціску пнеўматычных тармазных сістэм транспартных сродкаў") — другое месца; А.Э.Паўловіч (вынаходства "Стэнд для выпрабавання тармазных сістэм шматзвённых аўтамабільных і транспартных вытворчасцей") — трэцяе месца.

Правядзенне конкурсаў прадэманстравала высокі ўзровень навуковага патэнцыялу нашай акадэміі. З улікам павелічэння колькасці ствараемых у БДПА манаграфій патрэбна прадумаць пытанне аб магчымасці правядзення аднаведнага конкурсу штогод. Чакае свайго вырашэння і пытанне аб мэтазгоднасці рэгулярнага правядзення конкурсу падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

Улядзімір ЛАЗАРАЎ,
загадчык патэнтна-інфармацыйнага аддзела навукова-даследчага сектара БДПА, член конкурсных камісій.

Адораныя дзеці

Талент раскрываецца ў працы

Нясвіжская беларуская гімназія існуе з 1991 года. Сёння паўстала праблема ўдасканалення работы са здольнымі вучнямі. Таму і была распрацавана праграма "Адораныя дзеці", над выкананнем якой працуе Нясвіжская гімназія. Работа па рэалізацыі вышэйназванай праграмы вядзецца ва ўрочны час і ахоплівае педагогаў, вучняў і іх бацькоў.

Для паспяховай работы са здольнымі вучнямі педагогі павінны перш за ўсё ведаць псіхолага-педагагічныя асаблівасці такіх дзяцей. Усе настаўнікі гімназіі з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі семінара псіхолага-педагагічных ведаў, формамі работы якога з'яўляюцца лекцыі (для правядзення іх запрашаюцца навукоўцы), семінары, дыскусіі, практыкумы і псіхалагічныя трэнінгі.

Праблемны семінар "Напрамкі і метады развіцця творчых здольнасцей вучняў" праводзіцца разам з цыклавой камісіяй псіхалогіі і педагогікі Нясвіжскага педкаледжа. У час работы праблемнага семінара распрацавана карта "Творчыя здольнасці асобы вучня", абмеркаваны базавыя мадэлі ўрокаў, накіраваныя на развіццё творчых здольнасцей, праведзена арганізацыйна-дзейнасная гульня "Інавацыі і творчыя дасягненні асобы дзіцяці".

Метадычныя кафедры і аб'яднанні педагогаў паглыблена працуюць над тэмай "Развіццё інтэлектуальных здольнасцей і мыслення вучняў у працэсе навучання".

Возьмем, напрыклад, кафедру настаўнікаў прыродазнаўча-матэматычнага цыкла. У плане работы гэтай кафедры — распрацоўка тэматыкі індывідуальнай навукова-метадычнай работы з падвядзеннем вынікаў у канцы навучальнага года, аналіз тэкставых кантрольных работ у профільных класах, семінар "Псіхалагічныя і педагагічныя асновы ўрока" і інш. Акрамя таго, кафедра цесна супрацоўнічае з БДПУ імя М.Танка. Штомесяц выкладчык кафедры матэматыкі універсітэта праводзіць заняткі з вучнямі гімназіі на працягу двух дзён.

Кафедра настаўнікаў прадметаў гуманітарнага цыкла разглядала наступныя пытанні: "Работа з тэкстам — аснова арганізацыі самастойнай дзейнасці вучняў", "Развіццё пазнавальнай матывацыі і цікавасці вучняў", рыхтавала матэрыялы да правядзення псіхолага-педагагічнага кансіліума "Асаблівасці адаптацыі вучняў пятых класаў".

Вялікая ўвага надаецца падрыхтоўцы і правядзенню педагагічных саветаў. Навукова-метадычны савет і дырэкцыя стараюцца арганізаваць педсаветы такім чынам, каб кожны з іх быў нестандартным па форме, каб змест яго як мага глыбей закранаў надзённыя праблемы.

У другім паўгоддзі мінулага года калектыў рыхтаваўся да педсавета "Свет дзіцяці ва ўмовах рэалізацыі праграмы "Адораныя дзеці"". У рамках падрыхтоўкі да педсавета была вывучана неабходная літаратура, праведзены пасяджэнні кафедраў, праблемны семінар. Вялікую зацікаўленасць выклікаў тыдзень педагагічнага майстэрства, у час правядзення якога настаўнікі гімназіі правялі адкрытыя ўрокі, кожны з іх меў сваю "аўтарскую" задумку. Псіхолаг гімназіі правёў анкетаванне вучняў. Сам педагагічны савет, у якім прыняў удзел амаль кожны педагог, праходзіў у форме ролева-дзейнаснай гульні.

— Праграма "Адораныя дзеці" можа мець поспех толькі тады, калі ў ёй будуць прымаць актыўны ўдзел і самі дзеці, калі яны самі будуць зацікаўлены ў развіцці сваіх здольнасцей, — зазначае дырэктар Т.У.Юрэвіч.

З гэтаю мэтаю ў гімназіі працуюць 17 факультатываў і курсаў па выбары, арганізавана сістэматычная індывідуальная работа па падрыхтоўцы навучэнцаў да алімпіяд і паступлення ў ВНУ. Вырашаючы адну з галоўных задач — фарміраванне ў гімназістаў навыкаў самаадукацыі, распрацаваны шэраг мерапрыемстваў па прыцягненні іх да пошукавай і навуковай работы. Кожны вучань гімназіі мае "Асабістую картку", дзе запісвае ўсе свае дасягненні і поспехі. Работа спланавана так, каб вучні ўсіх узростаў мелі магчымасць рэалізаваць свае запыты ў пазнавальнай дзейнасці. Так, для навучэнцаў малодшых класаў арганізаваны вусны часопіс "Чамучка", на пасяджэннях якога ў цікавай форме дзеці атрымліваюць веды аб акружаючым іх свеце.

Вялікую работу праводзяць навучэнцы гімназіі пры падрыхтоўцы да інтэлектуальнага марафону, які ахоплівае тры цыклы: "матэматыка", "мовы" (руская, беларуская, англійская), "культуралогія" (гісторыя, музыка, культура).

Дзень правядзення інтэлектуальнага марафону, над падрыхтоўкай якога шмат працуе і настаўніцкі савет, і вучнёўскі камітэт, з'яўляецца сапраўднай падзеяй ў жыцці гімназіі. Кожны вучань мае магчымасць паказаць свае веды, а затым параўнаць сябе з астатнімі ўдзельнікамі. Пры падвядзенні вынікаў абвяшчаюцца толькі пераможцы, а асататнія атрымліваюць ліст, дзе пазначаны балы, якія яны атрымалі за свае веды. Робіцца гэта дзеля таго, каб кожны меў магчымасць убачыць свае або поспехі, або няўдачы.

А вось старшакласнікі маюць больш складаную задачу. На працягу вучэбнага года разам са сваімі настаўнікамі яны працуюць над тэмамі, рыхтуючыся да навукова-практычнай канферэнцыі. Канферэнцыя, якая праходзіла ў мінулым годзе, паказала, што некаторыя работы падрыхтаваны сур'ёзна і дасканала. Так, вучань 9-га класа Сяргей Шчурскі правёў даследаванне жыцця і творчасці беларускага паэта, свайго земляка Новіка-Пеюна. Дарэчы, работа гэтага вучня атрымала дыплом трэцяй ступені на Рэспубліканскай вучнёўскай канферэнцыі, якая праходзіла ў сакавіку 2000 года ў рамках праграмы ААН "Культура міру". Вучаніца 11-га клас

Инструктивно-методическое письмо Министерства образования

Организация и проведение экзамена по мировой художественной культуре

Курс "Мировая художественная культура" в качестве обязательного предмета введён в 9 — 11 классах школы в 1996 году. И как показал опыт, этот предмет занял достойное место в школьной программе.

Утверждён и введён в действие приказом министра образования от 30.12.1998 №698 руководящий документ — образовательный стандарт "Искусство" для общего среднего образования, который устанавливает требования к объему учебной нагрузки, уровню подготовки учащихся по предметам эстетического цикла, в том числе по мировой художественной культуре, критерии оценки, измерители и систему контроля выполнения требований стандарта. В разделе "Оценка выполнения требований образовательного стандарта" одним из методов контроля за усвоением знаний утвержден экзамен. Поэтому экзамен по мировой художественной культуре — один из экзаменов по выбору учащихся в 11-м классе.

Один из показателей престижа предмета (особенно для учащихся) — это уровень контроля за знаниями. И тот факт, что все большее количество учеников сознательно выбирают на выпускных экзаменах предмет "Мировая художественная культура", говорит о возросшем престиже данного предмета. Вот почему так актуален вопрос об организации экзамена по МХК, тем более что, по сравнению с другими дисциплинами школьной программы, здесь накоплено гораздо меньше опыта.

Для проведения экзамена Министерством образования разработаны билеты. Одновременно разрешается и другая форма сдачи экзамена в виде написания реферата. Предлагаемые на выбор программы по МХК "Мировая художественная культура", "Человек в мире культуры" открывают большие возможности для творчества учителя, так как объём учебного материала значительно расширен и в программах предусмотрена вариативность в преподавании курса, учитывающая объективные и субъективные факторы и заключающаяся в предоставлении учителю возможности выбрать автора, его произведение, предложенное для разбора на уроке, или даже предпочесть другого автора. Поэтому вопросы билетов, предложенные Министерством образования, носят обобщенный характер. Исходя из этого учителю дано право составить для выпускного экзамена свои билеты, которые утверждаются в установленном порядке. Напоминаем, что, составляя экзаменационные билеты, учитель должен сохранить в них основные сведения об искусстве в различные эпохи, характерных чертах различных видов искусства, стилей, жанров, сведения об их наиболее ярких представителях, не забывая также о принципе интеграции, заложив его не только в основу построения программы, но и содержания билетов.

Учителю также необходимо помнить про то, что два вопроса экзаменационных билетов — теоретические, освещающие основные содержательные линии курса "Мировая художественная культура".

Третье же задание — практическое. Направлено это задание на то, чтобы определить, каков запас эстетических впечатлений ученика, его опыт общения с миром искусства.

Поэтому основная задача, которая стоит перед учеником в третьем задании — показать свой уровень воспитания эстетических ценностей. Ученик должен выделить наиболее характерные элементы заданного произведения соответствующего вида и жанра, уметь соотнести его с культурой определенной эпохи и региона и проанализировать в контексте этой эпохи и с позиций современного восприятия, используя свой запас искусствоведческих знаний, умение высказать свое собственное мнение и, при необходимости вести дискуссию. Учитель может дать в третьем вопросе билета несколько вариантов произведений, что позволит учесть психологические особенности ученика, который будет отвечать на этот вопрос. Для того чтобы экзамен по МХК прошёл на достаточно высоком уровне и не превратился в формальность, нужно правильно его организовать.

Обязательным условием продуктивного проведения экзамена является его обеспечение наглядными, аудио- и видеоматериалами.

Готовясь к ответу, ученик будет иметь возможность подобрать соответствующие слайды, репродукции, музыкальные записи. Хорошо ориентироваться в них он сможет лишь в том случае, если они расположены в кабинете не хаотично, а систематизированы учителем по видам искусства, эпохам, авторам и т.д. и постоянно использовались на уроках МХК.

Важное значение имеет и оснащение процесса экзамена техническими средствами: диаскопами (для того чтобы каждый ученик мог автономно рассматривать подобранные слайды при подготовке к ответу), проигрывателем или магнитофоном с наушниками (для индивидуального прослушивания музыкальных фрагментов), видеомагнитофоном, слайдопроектором и экраном (для демонстрации слайдов или фрагментов видеофильмов во время ответа ученика).

Перечень необходимых пособий и средств обучения дан в Инструктивно-методическом письме Министерства образования РБ к 2000 — 2001 учебному году "Мастацтва" ("Настаўніцкая газета" от 10 августа 2000 года).

В ответе ученика на экзамене по МХК оценивается правильность и полнота его знаний важнейших эстетических понятий, фактов, имен, названий, терминов из истории искусств и начал эстетики, владение элементами искусствоведческого анализа (соотнесение конкретных художественных явлений с определенной страной, эпохой, стилем, направлением в искусстве), обоснованность личностного отношения к произведениям искусства, умение применять полученные искусствоведческие знания при оценке явлений современной художественной жизни, а также логическое построение ответа, его последовательность и языковое оформление.

Другой формой сдачи экзамена по мировой художественной культуре по желанию учащихся является защита реферата.

Право сдавать экзамен в этой форме предоставляется учащимся, показавшим отличные знания по мировой художественной культуре, заинтересованность в предмете, способности в выполнении проблемно-поисковых и творческих заданий и исследовательской работы. В индивидуальных случаях разрешается сдавать экзамен ученикам с хорошими знаниями (например, в том случае, если ученик хочет повысить итоговую оценку).

Учащиеся, желающие сдать экзамен путем защиты реферата, должны быть проинструктированы учителем МХК и отдавать себе полный отчет в том, что реферат — это не простое переписывание материала из какого-нибудь источника, а достаточно серьезная работа, написанная учеником самостоятельно. Это аналитическое исследование описательного характера, необходимое для усвоения и оценки уже имеющейся научной информации. М.А.Ломоносов так сформулировал основные требования к реферату и его автору: "Кто берется сообщить публике содержание новых сочинений... предпринимает труд тяжелый и весьма сложный, которого цель не в том, чтобы передавать вещи известные и истины общие, но чтобы уметь схватить новое и существенное в сочинениях, принадлежащих иногда людям самым гениальным". (Цитируется по книге В.И.Соловьева "Сопоставление и редактирование реферата". М., 1975, с.6.)

Название "реферат" произошло от латинского referre — сообщать, докладывать. Целью написания реферата является демонстрация уровня теоретических и практических знаний по МХК, используемых для самостоятельного исследования искусствоведческого характера. В процессе выполнения реферата учащиеся расширяют свой кругозор, выходя за рамки программы изучаемого курса, развивают навыки самостоятельной работы по сбору, осмыслению, аналитико-синтетическому преобразованию и обоснованию информации, необходимой для раскрытия избранной темы. В реферате обязательно должно быть выражено отношение автора к данной информации, ее оценка, т.е. проявлен творческий подход к разработке темы.

Работа над рефератом предполагает использование учеником дополнительной литературы по теме, периодики, а также возможность консультироваться со специалистом, владеющим такими материалами. Руководителем работы может быть учитель по одному из предметов эстетического цикла.

Особого внимания заслуживает момент выбора учеником темы для своего реферата. Тему для реферата ученик выбирает самостоятельно, но рекомендательный список примерных тем может составить учитель согласно той программе по мировой художественной культуре, по которой он выстроил учебный курс. Тема не должна повторять темы разделов программы или темы уроков. В ней должна быть сформулирована проблема, которую ученик будет решать в процессе написания реферата.

Тема должна носить интегративный характер, т.е. охватывать несколько видов и жанров искусства, его стили и направления в их взаимосвязи.

Это могут быть и транскультурные исследования (сравнительный анализ искусства различных регионов): Востока — Запада, Беларуси, России — Западной Европы, Западной Европы — Америки и т.д.). В реферате может быть дан сравнительный анализ произведений, относящихся не только к различным видам искусства, но и к разным эпохам, т.к. сочетание, соразмерность произведений искусства может быть не по времени, а в философском ключе. Кроме того, таким образом уместно прослеживать развитие отдельных жанров, тем, проблематику произведений искусства.

Приоритетными считаются темы, раскрывающие богатство культуры Беларуси. Наиболее ценным представляется включение в такую тему особенностей культурного пространства, в котором проживает ученик.

Подсказать проблему и конкретизировать тему реферата поможет и использование энциклопедий для школьников по различным предметам (например, "Всемирная история", энциклопедические словари по предметам, темы по искусству в "Детской энциклопедии" и т.д.). В них выстраиваются временные параллели, которые и подсказывают проблему.

Начинать работу целесообразно не с постановки проблемы, а с того, какую эпоху ученик знает лучше и каким материалом располагает. Затем он должен определиться, какие проблемы атуальны и интересны лично для него, т.к. реферат — это прежде всего его собственная трактовка темы и разрешение проблемы, которую она затрагивает.

При формулировке темы необходимо стремиться полнее отражать основные смысловые аспекты содержания реферата. Ключевые слова, входящие в заглавие, должны быть ясными, понятными даже вне контекста и представлять собой общепринятые, а не узкоспециальные искусствоведческие термины.

Следует обратить внимание на стиль и язык работы. Материал должен излагаться точно, ясно, с логической последовательностью и органической связью между отдельными вопросами и каждого из них с общей темой, с использованием искусствоведческой терминологии.

Ключевые слова и понятия реферата уместно определять, используя словари и справочники.

Реферат, как правило, излагается своими словами. Цитаты используются в том случае, если они необходимы для более глубокого понимания сути освещаемого вопроса и его содержания или если референт (автор реферата) возражает против содержания данной цитаты. При использовании цитат из монографий, статей и другой литературы следует назвать источник, для чего на странице под текстом дается ссылка на него с указанием фамилии и инициалов авторов, полного названия работы, издательства, места и года издания, страницы или указывается порядковый номер по списку источника, выделенный двумя косыми чертами или квадратными скобками, например: 2, с.13, где первая цифра — номер источника в общем списке, вторая — номер страницы.

Непрямое цитирование (т.е. пересказ позиций авторов различных источников) также должно быть обозначено соответствующей ссылкой, для того чтобы отделить в тексте мнение автора реферата от мнений других авторов.

В процессе работы ученика над рефератом учитель мировой художественной культуры проводит консультации, настраивая ученика на грамотное использование необходимых источников, учит его аналитически относиться к содержащейся в них информации. На одной из первых консультаций ученику необходимо объяснить, что большую роль в продуктивности написания реферата играет правильная организация работы. Важно, чтобы главная мысль реферата была четко сформулирована, умело подобраны и правильно структурированы литературные источники, выписки, цитаты, сделаны закладки в книгах, что позволит быстро найти материал, необходимый для наиболее полного раскрытия темы.

Структура реферата определяется исследователем, но следующие части в нем должны присутствовать:

— оглавление (план работы с указанием страниц);

— введение;

— основная часть, разделенная на подразделы;

— заключение;

— список литературы;

— приложение (если таковое имеется).

Во вступлении автор должен обосновать актуальность темы, ее значение, четко определить цель и задачи работы, дать краткую характеристику литературы по теме.

В основной части реферата анализируются и решаются поставленные во введении задачи. При освещении каждого вопроса необходимо использовать убедительный фактический материал, развернутые аргументы, рассуждения, сравнения. Особое внимание необходимо обращать на то, чтобы раскрытие каждого вопроса завершалось четкими обобщениями и выводами.

В заключении подводится итог всего исследования, кратко излагаются основные выводы по теме в целом.

Список использованной литературы дается в алфавитном порядке фамилий первых авторов. Общий объем реферата 20 — 25 страниц. Страницы должны иметь поля и нумероваться по порядку. Первая страница — титульный лист, она не нумеруется. На следующем листе в правом верхнем углу проставляется цифра "2" без точки и черточек и т.д. На титульном листе реферата указываются школа, класс, фамилия и инициалы учителя, который руководил работой ученика над рефератом.

Реферат сдается учителю-руководителю не позднеее, чем за две недели до экзамена. Члены экзаменационной комиссии также должны ознакомиться с содержанием реферата до экзамена.

Руководитель темы обязательно должен дать рецензию на реферат.

Написанный реферат становиться основой для его устной защиты на экзамене. Защита реферата — это не пересказ его содержания. Ученик должен показать, каким образом он реализует поставленные во введении задачи, каковы уровень его культурологической подготовки, навыки самостоятельной проблемно-исследовательской работы, умение применять искусствоведческие знания в решении конкретных проблем. Обращается внимание на качество оформления реферата в целом (грамотность, стиль и т.д.).

Министерство образования предлагает перечень примерных тем рефератов за курс средней школы. Исходя из этих методических подходов к выбору и трактовке темы, уровня требований и глубины исследовательской работы над рефератом, а также варианта программы учитель может предложить ученику свою тему.

Примерные темы рефератов

по мировой художественной культуре за курс средней школы

1. Мифологические сюжеты в искусстве (на примере определенной эпохи, видов и жанров искусства).
2. Зрелищная и театральная культура Древней Греции и Древнего Рима: сравнительный анализ.
3. Мироощущение в античной культуре и отражение его в искусстве.
4. Мироощущение человека в культуре Средневековья и отражение его в искусстве.
5. Библейские сюжеты в литературе, музыке, изобразительном искусстве.
6. Особенности романского стиля в культуре западноевропейского Средневековья.
7. Образы ада и рая, добра и зла в искусстве западноевропейской художественной культуры.
8. Образ Мадонны в мировом искусстве.
9. Архетипические образы (образ Фауста, Гамлета, Дон Жуана и др.) в мировом искусстве.
10. Женские образы в искусстве (от Нефертити до современной модели).
11. Тема любви в искусстве.
12. Идеалы и антиидеалы в жизни и искусстве.
13. Романтизм как вечно актуальное направление в искусстве.
14. Воплощение образа исторической личности в драматургии, музыке, живописи.
15. Сатирическое в литературе, театре, кино, изобразительном искусстве, музыке.
16. Феномен фантастического в культуре XX века: литература, изобразительное искусство, кинематограф.
17. Символизм в искусстве XX века.
18. Сюрреализм в искусстве XX века.
19. Импрессионизм в искусстве XIX — начала XX века (на примере произведений литературы, изобразительного искусства, музыки).
20. Ведущие направления искусства XX века и их реализация в произведениях разных видов и жанров (направления, виды и жанры — по выбору).
21. Образы войны и мира в искусстве.
22. Взаимоотношения природы и человека в искусстве классицизма, романтизма и реализма: литература, живопись, архитектура.
23. Маринистический жанр в живописи, музыке, поэзии.
24. Жанр пейзажа в разных видах искусства: сравнительный анализ.
25. Анималистический жанр в искусстве (на примере определенной эпохи, видов и жанров искусства).
26. Жанр портрета в искусстве.
27. Творческая личность в искусстве.
28. Меценатство как явление в культуре.
29. История в красках и звуках: творчество М.Мусоргского, В.Сурикова и других.
30. Тема "Народ и власть" в искусстве ("Борис Годунов" А.С.Пушкина, М.Мусоргского, опера на сцене Национального академического тетра оперы и балета РБ и другие).
31. Судьба человека в искусстве: сравнительный анализ творчества А.Рублёва, А.Тарковского и других.
32. Искусство модное и вечное.
33. Отечественная история в литературе, музыке, изобразительном искусстве.
34. Искусство белорусской иконы.
35. Древнебелорусская архитектура.
36. Стиль барокко в искусстве Беларуси.
37. Исторические и культурные памятники родного города (села, региона).
38. Художественные промыслы, искусство народных мастеров Беларуси.
39. Декоративно-прикладное искусство Беларуси.
40. Искусство белорусского народного костюма.
41. Феномен "Витебской школы" в культуре.
42. Творчество М.Шагала.
43. Культура Несвижа.
44. Театральная культура Беларуси.
45. Национальный академический театр оперы и балета РБ.
46. Белорусский государственный академический театр имени Я.Купалы.
47. Национальный художественный музей РБ.
48. Гродно, Полоцк как культурные центры.
49. Музыкальная культура Беларуси XX века.

Обобщая вышеизложенное, следует констатировать, что при умелой организации экзамен по мировой художественной культуре может стать праздником общения с искусством для учителя и учеников, где они смогут говорить об искусстве средствами искусства, выразить себя как личность, проявив свою искусствоведческую, историческую и гуманитарную эрудированность, ведь экзамен — это продолжение обучения...

Весткі з Дзяржыншчыны

"Што нам рыхтуе новае стагоддзе?"

Пад такой назвай прайшло агульнараённае школьнае свята для вучняў, якія дабіліся поспехаў у вучобе, спорце, мастацтве, грамадска карыснай дзейнасці. Свята стала ўжо традыцыйным у час зімовых канікулаў. Праходзіла яно ў будынку гарадскога Дома культуры, дзе сабраліся больш за 200 дзяцей.

Сцэнарый падрыхтавалі работнікі Дзяржынскага раённага цэнтра дзіцячай творчасці. Ініцыятыва правядзення зыходзіла ад аддзела адукацыі. Напярэдадні свята праводзіўся конкурс школьных сачыненняў: "Пасланне ў трэцяе тысячагоддзе" і "Духоўныя хрысціянскія каштоўнасці для мяне". Зачытваліся ўрыўкі з лепшых сачыненняў вучняў — якім яны бачаць новае тысячагоддзе, у якім будуць людзі жыць шчасліва, дзе будзе вельмі многа розных адкрыццяў. Шмат думак у вучняў і пра павышэнне ролі духоўнасці ў людзей, якія будуць жыць у трэцім тысячагоддзі.

Удзельнікаў свята павіншаваў намеснік старшыні райвыканкама Аляксандр Крыварот. Ён выказаў спадзяванне, што сённяшнія ўдзельнікі свята стануць будучымі вучонымі, кваліфікаванымі спецыялістамі.

На сцэну падымаюцца ўдзельнікі і пераможцы спаборніцтваў, алімпіяд па асноўных прадметах, шахматных турніраў, экалагічнай вікторыны, злёту юных паэтаў, дзіцячых драматычных калектываў, злёту юных мастакоў, майстэрні "Умелыя рукі". Загадчык раённага аддзела адукацыі Мікалай Башко ўручае граматы пераможцам раённых алімпіяд. Усе ўдзельнікі свята атрымліваюць салодкія падарункі.

На свяце паказалі сваё майстэрства пераможцы школьнай мастацкай самадзейнасці і калектывы школы мастацтваў.

А напрыканцы — маладзёжная дыскатэка ля навагодняй ёлкі з удзелам Дзеда Мароза і Снягурачкі. Удзельнікі свята засталіся вельмі задаволенымі.

Вучоба дзіцячага актыву

На зімовых канікулах адбылася вучоба дзіцячага актыву — дзіцячага раённага парламента — прадстаўнікоў школьных грамадскіх арганізацый, органаў самакіравання, аб'яднанняў па інтарэсах. Гэта будучыя палітыкі і бізнесмены, кіраўнікі і арганізатары.

Падчас зімовай сесіі працавалі тры школы: школа піянерскага актыву, школа кветкаводаў і школа самакіравання і развіцця лідэрскіх уменняў. Атрыманыя веды падлеткі выкарыстоўваюць у непасрэднай рабоце ў сваіх школах.

Каляда завітала ў госці

Цікава прайшло свята "Народжаная зорка" — са свечкамі, вясёлымі гульнямі, забавамі для гурткоўцаў раённага цэнтра дзіцячай творчасці.

На гэтае свята прыехалі дзеці і з гурткоў, што працуюць на базе сельскіх школ.

Тамара ШАЎЧЭНКА,
сацыяльны педагог.

Праблемы зместу адукацыі

Стандарт дае дадатковую свабоду творчасці

Распрацоўка і стварэнне адукацыйных стандартаў з'яўляецца прыярытэтным накірункам развіцця рэформы адукацыі ў школах розных тыпаў Беларусі. Увядзенне адукацыйнага стандарту дае магчымасць вырашаць задачы і праблемы дэмакратызацыі адукацыі, галоўнай з якіх з'яўляецца сацыяльная абарона школьнікаў ад няякаснага навучання, а таксама абарона настаўнікаў ад некваліфікаванага кантролю. Праблема абнаўлення і карэкціроўкі зместу курса школьнай фізікі набывае новае гучанне ў сувязі са зменнем сацыяльнага заказу школе.

Адукацыйны стандарт па фізіцы распрацоўваўся на аснове пастаяннага суаднясення напрацоўваемых айчынных матэрыялаў з міжнароднай тэорыяй і практыкай. Асноўным накірункам пабудовы новага зместу прадмета павінна стаць яго дыферэнцыяцыя. Аднак, навучаючыся па розных праграмах, падручніках, кожны школьнік павінен атрымаць аснову, ядро, базу, якія павінны прысутнічаць у кожным вучэбным плане, у кожнай праграме. У сувязі з гэтым узнікла неабходнасць стварэння асаблівага інструмента кіравання адукацыяй. Такім інструментам і з'яўляецца адукацыйны стандарт, асноўная частка якога — агульная характарыстыка вучэбнай дысцыпліны, дзе выкладзены мэты, аб'екты вывучэння і асноўныя змястоўныя лініі прадмета (адукацыйнай галіны). Стандарт закліканы служыць асновай для распрацоўкі праграм па фізіцы.

У адпаведнасці з кіруючай канцэпцыяй распрацаванага дакумента выдзелены базавы ўзровень вывучэння вучэбнага курса фізікі — "...мінімальна неабходны аб'ём зместу вучэбнага матэрыялу, патрабаванні да засваення якога задаюцца як плануемыя вынікі навучання..." (стар. 10, ч. 1 стандарту). У якасці арыенціраў для ўстанаўлення мінімальна неабходнага аб'ёму зместу школьнай фізікі былі выбраны тэарэтычныя і метадычныя даследаванні, практычны вопыт работы школы па адборы і структурыраванні зместу, вызначэнні патрабаванняў да падрыхтоўкі вучняў ва ўмовах функцыянавання 11-гадовай школы.

Аналіз стандарту адукацыі па фізіцы паказаў, што істотных змен у змесце вучэбнага матэрыялу не адбылося. Гэтага і не павінна было адбыцца. Тлумачэнне даволі простае. У аснове распрацаванага стандарту ляжыць змест школьнага курса фізікі: "курс фізікі павінен утрымліваць... звесткі аб асноўных сучасных фізічных тэорыях, асноватворныя навуковыя факты, паняцці, тэарэтычныя мадэлі, законы" (стар. 99, ч. 3 стандарту).

Стандартам прадугледжана выдзяленне агульнапрынятых дыдактычных адзінак зместу школьнага прадмета: фактаў, уяўленняў, разуменняў, прычынна-выніковых сувязяў, заканамернасцяў, законаў, тэорый.

Кампаненты зместу сістэматызаваны і структураваны па тэмах, паслядоўных ступенях засваення школьнікамі вучэбнага матэрыялу (6 клас; 7 — 8 класы; 10 — 11 класы) і адлюстраваны ў выглядзе наступных груп ведаў: вызначэнні і адзінкі вымярэння фізічных велічынь у СВ; мадэлі цел, з'яў, прынцыпы; фізічныя заканамернасці, законы.

Пры рабоце са зместам стандарту адкрываецца шэраг магчымасцяў яго творчага выкарыстання настаўнікам-практыкам і вучоным-метадыстам. Разгледзім некаторыя з гэтых магчымасцяў на прыкладзе раздзела "Механіка".

Па-першае, змест данага раздзела бачыцца не ў якасці адвольнага набору, а ў выглядзе ўскладняючай сістэмы элементаў ведаў. Напрыклад, у 6 класе павінна быць разгледжана мадэль кропачнага фізічнага цела. У 7 — 9 класах вучням можа быць прапанаваны разгляд сістэмы матэрыяльных кропак, на аснове якой школьнікі будуць знаёміцца з мадэллю плоскай хвалі.

Па-другое, выразна праглядваецца ўнутрыпрадметная пераемнасць. Настаўніку дастаткова проста вызначыць, што для разгляду вертыкальна кінутага цела (7 — 9 класы) вучні маюць апорныя веды аб раўнамерным механічным руху (6 клас). У метадычным плане гэта садзейнічае распрацоўцы і састаўленню пазаўрочнага планавання.

Па-трэцяе, пры аналізе зместу па "вертыкалі" ад высноў разуменняў фізічных велічынь да фізічных заканамернасцяў і законаў прасочваецца шлях ускладнення фарміруемых ведаў школьніка. Так, засваенне школьнікамі паняццяў "адлегласць пройдзенага шляху", "хуткасць раўнамернага руху", "час (адзінкі)" павінна мець заключным этапам засваенне заканамернасці, дзе разглядаецца залежнасць адлегласці шляху ад хуткасці і часу руху пры раўнамерным руху.

Па-чацвёртае, стандарт наглядна дэманструе неабходнасць паўтарэння і абагульнення раней пройдзенага матэрыялу ў наступных класах. Гэта, напрыклад, датычыць прынцыпаў механікі (адноснасці, інерцыі і г.д.), законаў Ньютана ў інерцыйных сістэмах адліку. Аднак трэба ўлічыць, што стандарт выразна абмяжоўвае толькі ступені праходжання школьнікамі фізічных ведаў і аб'ядноўвае змест другой ступені (7 — 9 класы) і трэцяй ступені (10 — 11 класы), але не рэгламентуе жорстка час вывучэння таго ці іншага прынцыпу, закона і г.д. па канкрэтных класах.

У адпаведнасці з акрэсленымі ў стандарце элементамі фізічных ведаў выбраны фізічныя метады даследавання: назіранне фізічных з'яў, матэматычных метадаў, мадэляванне фізічных з'яў, разлік і прадказанне фізічных эфектаў на базе пабудаваных мадэляў, эксперыментальныя метады і метады апрацоўкі эксперыментальных даных. Пры выбары метадаў фізічнага даследавання настаўніку трэба ўлічыць, што не ўсе метады ў роўнай ступені павінны прысутнічаць на розных ступенях навучання школьнікаў. Так, матэматычныя метады пабудовы і абагульнення тэарэтычных мадэляў фізічных з'яў, разлік і прадказанне фізічных эфектаў на аснове пабудаваных мадэляў і тэорый пераважна адносяцца да курсаў фізікі ў 10 — 11 класах, калі вучні валодаюць гіпатэтыка-дэдуктыўным мысленнем.

Змест адукацыі залежыць ад мноства фактараў, якія праяўляюцца з рознай ступенню інтэнсіўнасці ў школах розных тыпаў. Для ўсіх, хто займаецца пытаннямі школьнай фізікі, больш дэталёвым адборам і структурыраваннем зместу, прапануем прыняць удзел ва ўдасканаленні адукацыйнага стандарту і яго асобных кампанентаў. Свае заўвагі і прапановы адрасуйце Нацыянальнаму інстытуту адукацыі (у лабараторыю зместу і тэхналогій навучання фізіцы).

Святлана ПУГАЧ,
старшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі.

Лексіс

Пра “штучныя нібыта адпаведнікі”

У публікацыі “Пра *гвалт, кляваць* і іншае” (“Настаўніцкая газета” за 24 кастрычніка 2000 года) І.Лепешаў ужо каторы раз навязвае беларускай літаратурнай мове чужыя словы і звароты. На гэты раз — фразеалагізмы *кляваць носам* і *куры не клююць*. І, як заўсёды, доказам яму служыць ягоная картатэка: “У маёй картатэцы ёсць 18 ужыванняў *кляваць носам* і ніводнага — *торкаць носам*, 13 — *куры не клююць* і 2 — *куры не дзяўбуць*”. Каб падмацаваць гэтак званую праўду, ён нападае на першы акадэмічны перакладны слоўнік пад рэдакцыяй Я.Коласа, К.Крапівы, П.Глебкі, бо нібыта гэты слоўнік парушыў норму літаратурнай мовы. У допісе І.Лепешава чытаем: “Руска-беларускі слоўнік” (1953), складзены ў цяжкіх ваенных і пасляваенных абставінах і без належнай картатэкі, перакладаў фразеалагізмы, генетычна звязаныя са словам *кляваць*, так: *клевать носом — торкаць носам, куры не клюют — куры не дзяўбуць*. Але гэтыя штучныя нібыта адпаведнікі, не падмацаваныя маўленчай практыкай, не прыжыліся і не маглі прыжыцца ў літаратурнай мове”.

Ці адпавядае гэтае сцвярджэнне І.Лепешава сапраўднасці?

Яго абвяргаюць усе сем перакладных руска-беларускіх слоўнікаў, якія ствараліся ўжо не “ў цяжкіх ваенных абставінах”. Вось што падае “Руска-беларускі слоўнік” пад рэдакцыяй К.Крапівы 1982 года (т.І, с. 357): *клевать носом — торкаць носам; денег куры не клюют* [у кого] — *грошай куры не дзяўбуць* [у каго]. Тое самае і ў найноўшых перакладных слоўніках 1993-1999 гг. Напрыклад, у РБС-1993 (т.І, с.633): *клевать носом — торкаць носам, денег куры не клюют* [у кого] — *грошай куры не дзяўбуць* [у каго]. І гэта натуральна, яно заснавана на адпаведных значэннях дзеясловаў *клевать* (руск.) і яго беларускім адпаведніку *дзяўбці*. І ў “Тлумачальным слоўніку беларускай мовы”(т.2, 1978, с.182) зафіксавана: “**ДЗЯЎБЦІ**... 1.Есці, хапаючы ежу дзюбай (пра птушак). *Каля дарогі шпацыравалі вароны, нешта дзяўблі ў каляінах і зусім не палохаліся фурманкі.* Чорны. *Галубы... пачалі патроху дзяўбці хлебныя крошкі і піць ваду.* Навуменка. 2. Біць, ударыць дзюбай. *Куры хваталі ежу і з зайздрасцю дзяўблі адна адну ў галаву.* Чорны. *Крумкач выдру дзюбаю дзяўбе...*Якімовіч... 3.Паслядоўнымі, частымі ўдарамі па чым-н. рабіць паглыбленне, адтуліну. *На ўзлессі дзяцел гулка дзёўб кару.* Куляшоў...”

Праўда, у гэтым жа слоўніку на с.703, на жаль, прадублявана гэта і ў адносінах да слова *кляваць*. Гэты артыкул перанесены сюды з 4-томнага “Слоўніка рускай мовы” (т.2). Параўнайма гэтыя слоўнікі: “**КЛЕВАТЬ** несов. 1. Есть, хватая пищу клювом (о птицах). 2. Ударять клювом... *Клевать носом... Куры не клюют*”. Тое самае і ў ТСБМ, толькі слова *клюв* заменена на слова *дзюба*: “**КЛЯВАЦЬ**... незак. 1. *што.* Есці, хапаючы, адшчыпваючы ежу дзюбай (пра птушак). *Куры клююць зерне...* 2. *каго-што.* Біць, ударыць дзюбай; дзяўбці. *Певень клюе ката... Кляваць (дзюбаць) носам... Куры не клююць*”.

Штучнасць, ненатуральнасць гэтага *кляваць* у беларускай мове “выпірае” з самой дэфініцыі (апісання значэння) слова, бо “есці, хапаючы ежу дзюбай” — гэта *дзяўбці (дзюбаць)*, а *кляваць* — гэта хапаць ежу *клювам*. Нарматыўным у беларускай мове ёсць толькі слова *дзюб* (*дзюба*) і няма слова “клюв”. Дык чым жа “кляваць?” Гэтую трасянкавую норму (з словам *кляваць*), якая была ўшчынута ў слоўнік падчас панавання ідэалогіі на зліццё нацыяў, іх культуры і мовы, не падаюць слоўнікі, што выйшлі ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь. Так, новы “Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы” 1996 года фіксуе толькі *дзяўбці* і не падае штучнага *кляваць*. Але ж майму апаненту І.Лепешаву гэтае “кляваць” больш блізкае, бо, працуючы 17 гадоў у сярэдняй школе выкладчыкам рускай мовы і літаратуры, ён надта звыкся з ім. Да таго ж гэта чалавек, які імкнецца ў любой спрэчцы браць верх, не зважаючы ні на што, ідучы на любую фальсіфікацыю. Вось самы апошні факт. У газеце “Наша слова” за 27 верасня 2000 года ён піша (пра П.Сцяцко): “Сам аўтар паведамляе, што “выдавецкі аддзел Гарадзенскага універсітэта мае некалькі сотняў замоваў на згаданыя мае кнігі”. Мне ж у выдавецкім аддзеле сказалі, што няма ніводнай замовы”. 18 кастрычніка 2000 года выдавецкі аддзел адверг гэтую хлусню. І газета вымушана была апублікаваць гэта. У нумары 43 за 1 лістапада пад загалоўкам “Вось якія гэтыя факты!!!” газета дала абяржэнне за подпісам першага прарэктара па навучальна-выхаваўчай працы і сацыяльных пытаннях І.П.Мартынава і начальніка выдавецкага аддзела Я.С.Барталевіч. Тут паведамляецца, што на “навучальны дапаможнік П.У.Сцяцко "Праблемы нормы, культуры мовы" выдавецкі аддзел універсітэта атрымаў 306 заказаў: 232 — ад універсітэтаў, інстытутаў, бібліятэк, выдавецтваў і іншых устаноў і 74 заказы — ад індывідуальных заказчыкаў”.

Дык чаму рэдактар аддзела навукі “Настаўніцкай газеты” Т.Кароткая зноў узяла пад сваё крылца І.Лепешава і падала ў друк неправераныя факты?

Павел СЦЯЦКО,
доктар філалагічных навук,
прафесар Гродзенскага
дзяржаўнага універсітэта
імя Янкі Купалы.

Крыху пра асаблівасці нацыянальнага характару

Калі я прачытала артыкул Паўла Сцяцко, першая думка, якая ў мяне ўзнікла, — не даваць яго ў друк. Наша газета, па-першае, не навуковае выданне, каб распачынаць мовазнаўчую дыскусію. Падругое, пра гэта пісала ўжо “Наша слова” (№ 23 за 1992 год). І, нарэшце, было проста ніякавата. Ніякавата ад таго, што два вучоныя мужы, якія так шмат зрабілі для вывучэння роднай мовы, шчырыя (наколькі ведаю) патрыёты Бацькаўшчыны, калегі па працы, людзі немаладога ўжо веку аніяк не ўтаймуюць свае амбіцыі (назавём рэчы сваімі імёнамі) і не знойдуць паразумення ў галоўным. Сёння, як гэта было ўжо шмат разоў у нашай гісторыі, зноў пастаўлены на карту лёс нашай мовы. Больш за тое. Мы ўсе задаём цяпер сабе пытанне: а што будзе з нашай дзяржавай, нашай незалежнасцю праз 10-20 гадоў? Ці не здарыцца так, што ўнукі ці праўнукі нашых непрымірымых апанентаў расцэняць спрэчкі сваіх продкаў як сухое паленца ў касцёр, так бы мовіць, глабалізацыі? У час, калі трэба ратаваць свае святыні, кансалідавацца, брацца за рукі, мы выясняем паміж сабой адносіны, нешта даказваем адзін аднаму, пры гэтым, нават у межах навуковай палемікі, размахваем, як сцягам, фактамі чужой біяграфіі: кім працаваў, да якой партыі належаў і інш. Адчуваеце, як моцна сядзіць у нас наша таталітарнае мінулае, якая знявечаная наша свядомасць, калі ў сваім калегу мы бачым не паплечніка, а нядобразычліўца, чужака і амаль што ворага.

Ці магчыма такое ў нашых суседзяў — літоўцаў, палякаў — або тых жа яўрэяў?

Згадваецца стары фільм. Назву і фабулу ўжо не памятаю, а вось фрагмент адзін запомніўся вельмі добра. Падзеі адбываюцца падчас другой сусветнай вайны ў канцэнтрацыйным лагеры. Некалькі чалавек спрабуюць ажыццявіць пабег. Але ў нейкі момант адзін з герояў фільма вырашае, што гэта можа быць правакацыя.

— Чаму я павінен табе верыць? — пытаецца ён у заводатара.

— Таму што і ты, і я — яўрэі, — адказвае той.

Вось так. Філасофія простая і ясная: давярай, падтрымлівай свайго суродзіча, і тады разам можна адужаць і малую бяду, і вялікую. Таму дзякуючы нацыянальнай ідэі расцярушаныя па ўсім свеце яўрэі, з часу выгнання якіх з гістарычнай радзімы прайшло амаль 2 тысячы гадоў, і змаглі стварыць свае дзяржаву, адрадзілі сваю старажытную мову.

У нас жа, беларусаў, усё не так. Як казаў некалі са скрухай Уладзімір Караткевіч, там, дзе два беларусы, там тры думкі. Трэцяя, відаць, належыць не заўсёды прысутнаму, але ўсюдыснаму суседу, які, пакуль беларусы спрачаюцца, дзейнічае ў сваіх інтарэсах. Згадайце нашу далёкую ці нават зусім яшчэ нядаўнюю гісторыю...

Але вернемся, як кажуць, “да нашых баранаў”. Змяніць свой намер адносна артыкула П.Сцяцко мяне прымусіла яго апошняя фраза. Не надрукаваць допіс — значыць даць падставу Паўлу Уладзіміравічу думаць, што супраць яго існуе нейкая змова, а ў “Настаўніцкай газеце” працуюць ворагі беларушчыны. Таму, выконваючы пажаданне шаноўнага мовазнаўца, заўважу наступнае: рэдакцыя заўсёды з вялікай павагай ставілася да сваіх сталых аўтараў, даючы зялёнае святло іх публікацыям. Займець у сённяшні скрушны час, поўны расчараванняў, скептыцызму і апатыі, цікавых і аўтарытэтных аўтараў — вялікая ўдача для журналіста.Чым больш аўтарскі актыў газеты — там больш чуйны яе слых і зрок. Таму прапаную і вам, паважаны Павел Уладзіміравіч, і ўсім, хто неабыякавы да нашай роднай мовы, стану яе функцыянавання, перспектыў развіцця, “сваё крылца”. Пішыце нам, аналізуйце, разважайце, крытыкуйце, урэшце, толькі пры гэтым, калі ласка, не пераходзьце на асобы, не шукайце ворагаў, не абвінавачвайце ў нашых бядотах увесь свет. Гэта мы ўжо праходзілі. Давайце вучыцца жыць годна.

І яшчэ. Нагадваю тое, што ў зыходных дадзеных у кожным нумары нашай газеты на чацвёртай старонцы можна прачытаць: адказнасць за дакладнасць прыведзеных у публікацыі фактаў, звестак і іншай інфармацыі ляжыць на яго аўтары; меркаванне аўтара публікацыі не абавязкова адлюстроўвае пункт гледжання рэдакцыі.

З пажаданнем усім нашым цяперашнім і будучым аўтарам творчых задум, светлых памкненняў, лёгкага пяра і з надзеяй, што працяг сумнай гісторыі пад назвай “Як пасварыліся Іван Якаўлевіч з Паўлам Уладзіміравічам” не будзе, —

Тамара КАРОТКАЯ,
рэдактар аддзела навукі
“Настаўніцкай газеты”.

Гаспадыні

Салодкія стравы

Апельсіны ці мандарыны ў цукровым сіропе

2 — 3 апельсіны ці мандарыны, 4 — 5 сталовых лыжак цукру, 0,5 шклянкі вады, цэдра на смак.

Апельсіны ці мандарыны абабраць, вострым нажом нарэзаць кружочкамі. Цэдру надзерці на тарцы ці нарэзаць тонкай саломкай і апарыць кіпнем (каб выйшла гарката). Адкінуць на сіта і даць вадзе сцячы.

Прыгатаванне сіропу. У гарачую ваду пакласці цукар, давесці да кіпення і на слабым агні варыць некалькі хвілін, перыядычна знімаючы пену. Працадзіць і астудзіць. Пакласці ў крэмніцу горачкай нарэзаныя плады, перасыпаць іх падрыхтаванай цэдрай, заліць астуджаным цукровым сіропам.

Дэсерт “Загадка”

Палова гарбуза, 0,5 шклянкі апельсінавага сіропу, 0,5 шклянкі журавінавага лікёру, 100 грамаў тварагу, 2 сталовыя лыжкі цукру, 6 грэцкіх арэхаў, ванілін — на смак.

Для жэле: 0,5 шклянкі журавін, 1 шклянка вады, 2 сталовыя лыжкі цукру, 10 грамаў жэлаціну.

Гарбуз вчысціць ад скуры і семак, з мякаці нарэзаць фігуры рознай формы (шарыкі, полыя шарыкі, зорачкі, кружочкі, ромбікі), апусціць іх у апельсінавы сіроп і праварыць на працягу 5 — 10 хвілін, астудзіць, дадаць журавінавы лікёр і суткі настойваць. Гарбуз выняць з сіропу, полыя шарыкі запоўніць фаршам з працёртага тварагу, цукру, прасмажанага натоўчанага арэха і ваніліну.

Асобна прыгатаваць журавінавае жэле. У шкляную крэмніцу пакласці дробна парэзанае журавінавае жэле, зверху — падрыхтаваны гарбуз, паліць сіропам, у якім ён настойваўся. Шарыкі ўпрыгожыць шакаладам, надаўшы ім форму садавіны.

Рыбныя стравы

Рыбныя “каштаны”

400 грамаў філе рыбы, 5 — 6 лустачак тпанічнага хлеба, 4 сталовыя лыжкі малака ці вады, 2 сталовыя лыжкі тпанічнай мукі, палова яйка, перац молаты і соль на смак.

Для фаршу: 1 яйка, 20 грамаў зялёнай цыбулі, соль на смак.

Філе рыбы і хлеб, папярэдне замочаны ў вадзе ці малацэ, прапусціць праз мясарубку, дадаць соль, перац і перамяшаць, з атрыманай масы зрабіць невялікія кружочкі, на сярэдзіну якіх пакласці начынку (пакрышанае крута званае яйка і шаткаваную зялёную цыбулю), затым краі кружочкаў злучыць і надаць ім форму шарыкаў. Абкачаныя ў муцэ шарыкі абмакнуць у яйка і абкачаць у дробна нарэзаных і абсмажаных да светла-жоўтага колеру кубіках пшанічнага хлеба.

“Каштаны” абсмажыць у вялікай колькасці алею. Падаць з гарнірам, які складаецца са смажанай або варанай бульбы і свежай ці кансерваванай агародніны.

Карп з цыбуляй і чарнаслівам

1 — 1,5 карпа, 2 сталовыя лыжкі тпанічнай мукі, 4 сталовыя лыжкі алею, 4 цыбуліны, 0,5 шклянкі белага сухога віна, 0,75 шклянкі чарнасліву, 1 лімон, соль, перац.

Карпа апрацаваць, прамыць, абкачаць у муцэ, пакласці на бляху, паліць алеем і ва ўмерана гарачай духоўцы тушыць да паўгатоўнасці. На астатнім алеі пратушыць цыбулю, парэзаную скрылькамі, пакласці яе на карпа, пасаліць, папярчыць і заліць вінам. Вакол рыбы пакласці папярэдне замочаны ў цёплай вадзе чарнасліў і запякаць у духоўцы. Падаваць з лімонам.

Падрыхтавала
Аліна ЯНКОЎСКАЯ.

Абразок

Янка ГАЛУБОВІЧ

Васількова радасць

НОЧЧУ выпаў сняжок і выбеліў вуліцу, хаты, дрэвы на хутары. Ён, быццам крухмал, ажно хрупасцеў пад нагамі.

Але выглянула з-за хмар, прыгрэла сонейка, і пацяклі са стрэх слязьмі ледзяшы, на падворку ўтварыліся невялікія лужынкі. У іх чырыкалі, купаліся шэрыя верабейкі.

Не стрываў, выбег на падворак і Васілёк. Пастаяў ля лужынкі, у якой верабейчыкі ад радасці шалелі, і да дзеда Мікіты, у яго майстэрню, скіраваў.

А ў майстэрні піла гудзіць. З-пад яе горка стружак насыпалася. Ад стружак тых свежым смольным водарам цягне. Бы не ў майстэрню Васілёк ступіў, а ў сасновы бор, які за іхняй рэчкаю расце. Ажно галава злёгку ў хлопчыка закружылася.

Дзед Мікіта табурэтку майстраваў. Убачыў ён унука, усміхнуўся: відаць, спадабалася яму, што Васілёк за яго работай цікуе. Выключыў станок дый кажа так:

— Васілёк, скора шпакі прылятуць. Табурэтка нікуды не падзенецца. Давай лепей колькі шпакоўняў зробім.

— Зробім, дзядуля, зробім! — запляскаў ад радасці ў далонькі Васілёк.

Да вечара дзед Мікіта з Васільком змайстравалі ажно чатыры шпакоўні. Тры павесілі ў садзе на яблынях, а чацвёртую — на дубе, ля самай сажалкі на выгане.

Даўно сышоў з палёў снег. Пракалоў ля плота зямлю пырнік, кусты бэзу абсыпаліся зялёнымі хвосцікамі пупышак, распушыла каташкі вярба.

А аднойчы, надзіва сонечным, цёплым днём, у сад прыляцелі шпакі. Яны аблюбавалі на яблынях шпакоўні і пасяліліся ў іх. Чацвёртая, якая вісела на дубе, птушкам чамусьці не спадабалася. Яна заставалася пустой.

Засумаваў Васілёк. А дзед Мікіта і кажа яму: “Не хвалюйся, унучак, шпакам домік не спадабаўся, дык вераб’і ў ім паселяцца”.

Але прайшоў тыдзень-другі, а шпакоўня на дубе так і засталася незаселенай. І вераб’ям яна не прыйшлася даспадобы.

Яшчэ болей засумаваў Васілёк. Усю ноч не спаў. А раніцою, калі ў садзе ля сваіх домікаў заспявалі шпакі, усхапіўся і да дуба пабег. Глядзіць, а на ім вавёрачка сядзіць! Прыгожая такая, рыжавата-чырвоная, а вушы з кутасікамі на канцах. Цокнула на Васілька і шуснула ў домік.

Навіна аб тым, што ў Васільковай шпакоўні на дубе пасялілася вавёрка, як маланка праляцела па ўсім хутары, дзе жыў хлопчык з дзедам.

Паглядзець вавёрку прыбеглі Васільковы сябры Алеська, Пятруська і Лявонка. У іхніх шпакоўнях у садзе таксама жылі шпакі. Але вось каб вавёрка пасялілася!

Для Васілька такая падзея была вялікай радасцю.

(Заканчэнне.
Пачатак у № 129, 135 за 2000 год і № 43 за 2001 год)

Фёдар ПАЛАЧАНІН

Не свая віна

Трагедыя ў трох частках

Верачка (*з захапленнем*). Мой новы свет здзіўляючa разнастайны і рэальны. Ён вельмі падобен на зямны. Я маю неабмежаваныя магчымасці развіваць свае лепшыя якасці. Для нас адбываюцца і лекцыі, і спектаклі...

Мальвіна (*перапыняе яе*). Няўжо праўда?!

Верачка. Праўда, мамка! Тут ёсць навуковыя лабараторыі, дзе працуюць маладыя людзі.

Мальвіна. Няўжо тут і працуюць?!

Верачка. У гэтым свеце ўсе працуюць.

Мальвіна (*зацікаўлена*). А што ж тут робяць?

Верачка. Робяць усё тое, што і на зямлі.

Мальвіна. Цікава... І колькі ж вам плацяць за работу?

Верачка. Тут, мамка, плацяць любоўю...

Мальвіна (*занепакоена*). Дачушка, дык а як жа ты працуеш са сваімі балючымі ручкамі і ножкамі?!

Верачка. Яны мне там балелі і нават моцна... Атруты прасіла... А цяпер нічога не баліць... У новым свеце не існуе фізічных пакут. Усе інваліды пакідаюць свае калецтвы, дэфекты і хваробы на зямлі.

Мальвіна. Не стамляешся, дачушка?

Верачка. Тут ніхто не стамляецца. У нас не бывае ночы, але душа можа адпачываць.

Мальвіна. Верачка! А цябе тут не крыўдзяць?

Верачка. У гэтым свеце не існуе несправядлівасці. Тут адзін закон для ўсіх. Я не сустракала ніякага зла. Яшчэ ні разу ніхто на мяне не крыкнуў, не папракнуў.

Мальвіна. Не сумуеш па дому?

Верачка. Першыя сорак дзён было самотна, а цяпер не... (*Пасля нейкага маўчання.*) Я маю магчымасць свабодна перамяшчацца на Зямлю і назад. У адзін момант можна трапіць куды захочаш і ўбачыцца з кім пажадаеш.

Мальвіна. А як жа ты перамяшчаешся?

Верачка. Нябесным шляхам пры дапамозе энергіі думкі.

Мальвіна. Калі маеш такую магчымасць, дык чаму ж, дачушка, нас з бацькам не наведваеш?!

Верачка. Я спачатку вельмі часта наведвала вас і заўсёды бачыла заплаканую мамку і татку, змарнелага ад гора. Вы, відаць, паверылі, што я памерла, і не ведаеце, што смерці няма. Ёсць толькі вечнае жыццё!

Мальвіна (*уздыхнуўшы*). Каб жа так было на самай справе!..

Верачка. Павер, мамка, што гэта так! Паўсядзённае жыццё тут цікавейшае і больш захапляючае, чым зямное. У ім пануе ўсёахопнае пачуццё любві і прыгажосці. Кветкі, дрэвы, жывёлы, птушкі і перш за ўсё людзі проста выпраменьваюць прыгажосць. (Пасля паўзы.) Чуеш, якая цудоўная музыка гучыць?!

Мальвіна (прыслухоўваецца). Нічога, акрамя грукату цягнікоў, не чую.

Верачка. Гэта ў вас там цягнікі, а тут спакой, цішыня і толькі душа поўніцца спевам.

Мальвіна (*не адразу*). Дачушка! Я паверыла б табе, каб сама пачула тую музыку і спеў, калі б убачыла тое, пра што ты расказала...

Верачка. Мамцы яшчэ рана гэта бачыць і чуць...

Мальвіна. Чаму рана? Растлумач мне, Верачка!

Вера (*крыху падумаўшы*). Прыйдзе твой час — сама ўсё зразумееш.

Знікае промень пражэктара. Калі загараецца святло, на сцэне дэкарацыі першай карціны. На лаўцы сядзіць, задумаўшыся, Мальвіна. Адчыняюцца ў хаце дзверы. На ганку з'яўляецца Дарафей.

Дарафей. Мальвіна! Дзе ты?

Мальвіна (*схамянулася*). Я тут!

Дарафей (*падыходзіць*). Думаў, што ты да суседкі пайшла ці, можа, тут з кім размаўляеш.

Мальвіна (*уздыхнуўшы*). Я са сваёй памяццю размаўляла.

Дарафей (*прысеў побач*). Колькі ж можна варушыць сваю памяць?!

Мальвіна. А я толькі і жыву успамінамі. (*Пасля нейкага маўчання.*) Ці ведаеш, які сёння дзень?

Дарафей (*крыху падумаўшы*). Субота.

Мальвіна. І не толькі субота... Сёння роўна адзінаццаць гадкоў, як ад нас назаўсёды паехала Верачка.

Дарафей. Па праўдзе кажучы, я гэта ведаў, толькі не хацеў табе напамінаць, каб не крануць тваю незагойную рану.

Мальвіна. Няўжо ты думаеш, што я калі-небудзь забудуся на той дзень?!

Дарафей (*становіцца на калені перад Мальвінай*). Мальвіна! Калі можаш, даруй мне, што я тады не паслухаў цябе і вырваў з тваіх рук Верачку! Хацеў зрабіць як лепш... (*Пасля паўзы.*) Каб не я, яна, напэўна, засталася б дома. І ўсё было б добра... Гэта я вінаваты, што так здарылася. Я сабе гэтага ніколі не дарую!

Мальвіна. Дарафей! (*Паказвае на лаўку.*) Прысядзь тут! Я табе вось што скажу...

(*Дарафей садзіцца побач з Мальвінай*). Я сама ва ўсім вінаватая!

Дарафей (*здзіўлена*). Чаму ты так думаеш?!

Мальвіна. Таму што не па-людскаму выправіла Верачку з дому.

Дарафей. Чаму так не па-людску?! Пры развітанні рэдка дзе абыходзіцца без слёз.

Мальвіна. Слёзы слязамі, а трэба было даць абраз пацалаваць, перакрысціць сваёй рукой і адправіць з Богам. А я са сваім плачам нават шчаслівай дарогі дачушцы не пажадала. Толькі, наплакаўшыся ўволю, наўздагон ёй пасылала і свае малітвы, і пажаданні. (*Пасля паўзы.*) Адразу не зрабіла так, як трэба, то і пасля нічога не дапамагло. (*Стукае сабе ў грудзі кулаком.*) Вось хто вінаваты ў няшчасці нашай Верачкі! Маці родная!..

Дарафей (*узрушана*). Мальвіна! Калі ў нас зайшла такая размова, я табе раскажу адну тайну, якую бярог адзінаццаць гадкоў. Нашу дачушку загубіла яе быўшая сяброўка Ірыяда. Яна Верачку...

Мальвіна (*перапыняе яго*). Дарафейка! Не расказвай далей!.. Я прашу цябе!.. (*Пасля нейкага маўчання.*) Я сама ўсё ведаю...

Дарафей (*здзіўлена*). Ты гэта ведаеш?!

Мальвіна. Ведаю...

Дарафей. І даўно?!

Мальвіна. Адзінаццаць гадкоў.

Дарафей. Мальвіна, хто табе расказаў?

Мальвіна. Вераччына сяброўка Аксана.

Дарафей. Мусіць, тады, як да нас прыязджала?

Мальвіна. Тады і расказала мне ўсё.

Дарафей (*нервова*). А я столькі гадкоў насіў у сваім сэрцы гэту тайну! Не раз хацелася расказаць табе, але бачыў, што твая рана не загойвалася. Таму і маўчаў...

Мальвіна. Мая рана навек застанецца адкрытай.

Дарафей. Мы ўсе дамовіліся не расказваць табе праўду. Хацелі хоць крыху зменшыць твой боль. Не хацелі далучаць да яго яшчэ і крыўду. (*Крыху падумаўшы.*) Нам жа і павестку на суд прысылалі. Я, не паказваючы яе табе, напісаў, што мы не зможам прыехаць.

Мальвіна (*уздыхае*). Што той суд?! Каб жа ён, здаецца, мог вярнуць нам Верачку... (*Выцірае ражком хусткі вочы.*) Няхай Бог пакарае тую сволач, што загубіла нявінную нашу дачушку.

Дарафей. Усе гэтыя гадочкі я лічыў сябе вінаватым перад Верачкай і вельмі няёмка было перад табой, што ведаў праўду і не мог сказаць.

Мальвіна. А я адразу не паверыла... Чула маё сэрца, што няпраўду гаворыце. Ды і па вачах бачыла... Не магла Верачка загінуць праз сваю неасцярогу. Я была ўпэўнена, што не свая віна была прычынай няшчасця. А пасля і Аксана пацвердзіла мае здагадкі.

Дарафей. Мальвіна, а чаму ты мне нічога не расказала?

Мальвіна. Не хацела расстройваць цябе. Думала, што ты не ведаеш.

Дарафей. Ведаю... (*З горыччу.*) Не свая віна...

КАНЕЦ

Анатомія шэдэўра

Урокі “касмічнай” лірыкі Аляксандра Блока

Чалавека ад усіх жывых істот адрозніваеі не толькі развітая свядомасць, але і дар драматычнай рэфлексіі, якая складае саму аснову развітай свядомасці асобы. Драматычнае мысленне — наш агульны культурны інварыянт, які ўзнаўляецца на працягу ўсяго чалавечага жыцця як рэакцыя “перажывання” на цяжкасці і праблемы паводзін і дзейнасці гома сапіенс.

Сярод чалавечых цяжкасцей і праблем ёсць часовыя, мінучыя, але ёсць і такія, якія недаступныя для адназначнага вырашэння не толькі сіламі якой-небудзь пэўнай асобы, але і сіламі і сродкамі нават усяго чалавецтва. Напрыклад, тэарэтычна ў прынцыпе немагчыма адназначна адказаць на “вечнае”, “праклятае” этыка-светапогляднае пытанне: ці ёсць высокі сэнс у чалавечым жыцці і дзейнасці з улікам абмежаванасці яго фізічных і інтэлектуальных сіл і наогул нядоўгага зямнога існавання?

Да прыкладу, не ўяўляецца магчымым ні сіламі індывідуума, ні сіламі чалавецтва адназначна і рацыянальна вырашыць дылему — што больш мэтазгодна ў гэтым свеце: арыентацыя на разборлівасць у выбары сродкаў або наадварот? Вялікае драматычнае напружанне ў душы чалавека стварае сітуацыя вострай грамадскай канкурэнцыі, сацыяльная адзінота як прадукт сацыяльнай канкурэнцыі і нават так званае “касмічнае” адзіноцтва, светаадчуванне, якое ператварылася ў масавы элемент асобаснай псіхалогіі з XVI стагоддзя ў сувязі з капернікаўскім пераваротам у поглядах на прыроду Сусвету. Пра сацыяльнае адзіноцтва людзей напісана столькі многа і грунтоўна, што гаварыць на гэтую тэму тут няма ніякай неабходнасці. Што ж да прыроды касмічнага ўплыву на псіхалогію людзей, то абмеркаванне гэтай тэмы практычна толькі пачынаецца. Але ўжо цяпер, прынамсі, зразумела: і сама тэма, і праблематыка, якая адсюль вынікае, маюць вялізнае значэнне і для навуковай, і для мастацкай культуры.

Яшчэ на заранку стварэння сучаснай культуры, у эпоху Асветы, вялікі французскі вучоны Блез Паскаль у сваіх “Думках” пісаў: “Што такое чалавек у бясконцасці? Гэта вечнае маўчанне бясконцай прасторы палохае мяне. Я не ведаю, хто мяне паслаў у гэты свет, што я такое. Я зусім нічога не ведаю. Я бачу бясконцую прастору Сусвету, якая заключае мяне ў сябе, я адчуваю сябе прывязаным да аднаго кутка гэтага неабсяжнага свету, не ведаючы, чаму я змешчаны менавіта ў гэтым, а не ў іншым месцы, чаму той кароткі час, у якім мне наканавана жыць, прызначаны менавіта ў гэтай, а не ў іншай кропцы цэлай вечнасці. Я бачу з усіх бакоў толькі бясконцасць, якая ўключае мяне як атам. Я як цень, які доўжыцца толькі імгненне і ніколі не вяртаецца. Усё, што я ўсведамляю, гэта толькі тое, што я павінен хутка памерці. Вось маё становішча: яно поўнае нікчэмнасці, слабасці, цемры”. (Тарасаў В.П., Паскаль, М., 1979. — С. 283.)

З тых паскалеўскіх часоў, як справядліва адзначае беларускі філосаф В.Ф.Мартынаў, вобраз абыякавага, сляпога, бязмэтнага Сусвету стаў тыпажнай з'явай у светапоглядзе людзей тэхнакратычнай цывілізацыі. Адчуванне “касмічнага” адзіноцтва, такім чынам, цалкам натуральна трансфармуецца ў свядомасці чалавека ў адчуванні сацыяльнага адзіноцтва, якое мае, зразумела, вялікі набор перадумоў і матываў. Відавочна і іншае: пададзены вышэй матэрыял фактаў і палажэнняў гаворыць пра тое, што звязка “касмічны драматызм свядомасці чалавека — драматызм сацыяльнай свядомасці асобы” — схіляе чалавека да актыўнага мыслення і пошукаў, па меншай меры, псіхалагічнага вырашэння свайго дыскамфортнага стану. “Касмічная” паэзія якраз і займаецца мастацкім афармленнем рэфлексіі, якая развіваецца па такім сцэнары.

Але звернемся да канкрэтных мастацкіх тэкстаў А.Блока.

Миры летят.
Года летят. Пустая
Вселенная глядит
в нас мракам глаз.
А ты, душа, усталая, глухая,
О счастии твердишь —
который раз?
Что счастие?
Вечерние прохлады
В темнеющем саду,
в лесной глуши?
Иль мрачные,
порочные услады
Вина, страстей,
погибели души?
Что счастие?
Короткий миг и тесный,
Забвенье, сон и отдых
от забот...
Очнешься — вновь безумный,
неизвестный
И за сердце
хватающий полет...
Вздохнул, глядишь —
опасность миновала...
Но в этот самый миг —
опять толчок!
Запущенный куда-то,
как попало,
Летит, жужжит,
торопится волчок!
И, уцепясь за край скользящий,
острый
И слушая всегда
жужжащий звон —
Не сходим ли с ума мы
в смене пестрой
Придуманных причин,
пространств, времен...
Когда ж конец?
Назойливому звуку
Не станет сил
без отдыха внимать.
Как страшно все! Как дико! —
Дай мне руку,
Товарищ, друг!
Забудемся опять.

А цяпер давайце прачытаем другі верш вялікага паэта “Голоса скрипок”.

Из длинных трав встает луна
Щитом краснеющим героя,
И буйной музыки волна
Плеснула в море заревое.
Зачем же в ясный час
торжеств
Ты злишься,
мой смычок визгливый,
Врываясь в мировой оркестр
Отдельной
песней торопливой?
Учись вниманью
длинных трав,
Разлейся в море
зорь бесцельных,
Протяжный голос свой
послав
В отчизну скрипок
запредельных.

А.Блок (1880 — 1921) набыў шырокае прызнанне дзякуючы многім асобасным і творчым вартасцям. Блоку-мастаку, безумоўна, вельмі дапамагаў Блок-чалавек, які, паводле слоў А.В.Луначарскага, “вельмі глыбока мысліць і адчувае”. Як майстар мастацкага слова А.Блок, падобна свайму старэйшаму сучаснику А.П.Чэхаву, вызначаўся дзівосным уменнем па-мастацку распрацоўваць адначасова некалькі тэм і, адпаведна, гарманічна спалучаць у адзінае мастацкае цэлае адразу некалькі пластычных і псіхалагічных вобразна-мастацкіх ліній. Так, у прыведзеным вершы аб'яднаны вобразныя рады “касмічны” і “зямны”, прычым першы выконвае ролю інтэр'ера, больш шырокага фону для другога. У дадатак да сказанага хочацца звярнуць увагу чытача на яшчэ адну знакавую рысу паэтычнай манеры А.Блока, якую я не назіраў у іншых паэтаў. А.Блок, які прайшоў школу захаплення сімвалізмам, навучыўся ствараць вобразы-метафары, здольныя ў межах аднаго і таго ж верша па-мастацку вызначаць розныя і сэнсава далёкія з'явы і факты:

Что счастие?
Короткий миг и тесный,
Забвенье, сон и отдых
от забот...
Очнешься — вновь безумный,
неизвестный
И за сердце
хватающий полет...

У прыведзенай страфе “палёт” — метафара, якая пазтычна характарызуе адначасова і жыццё чалавека, і рух планеты Зямля ў прасторы Сусвету.

Вздохнул, глядишь —
опасность миновала...
И в этот самый миг —
опять толчок!
Запущенный куда-то,
как попало,
Летит, жужжит,
торопится волчок!

У гэтай страфе метафара “волчок” адначасова выкарыстоўваецца аўтарам і для паэтычнага абазначэння вялізнай залежнасці чалавечага лёсу ад навакольных абставін, і для — зноў жа — паэтычнай ацэнкі руху “зробленай” касмічнымі абставінамі планеты Зямля, якая круціцца ўжо мільярды гадоў не толькі вакол Сонца, але і вакол самой сябе.

Недасведчанаму чытачу можа здацца, што ўвесь верш “Миры летят. Года летят...” наскрозь прапітаны духам песімізму. Аднак не спяшайцеся рабіць падобныя заключэнні. Ужо згаданы Блез Паскаль адзначаў у сваіх “Думках”, што людзі даўно вынайшлі шмат спосабаў змагацца з адзіноцтвам перад тварам космасу, тварам лёсу, прыроды; гэтыя спосабы — навука, мастацтва, грамадскія справы, забавы, гульні, узаеміны з людзьмі. Лірычны герой А.Блока выбірае з гэтай мэтай чалавечыя ўзаеміны:

Как страшно все!
Как дико! Дай мне руку,
Товарищ, друг!
Забудемся опять.

Я ацэньваю фінал гэтага верша як аптымістычны. Я нават адважваюся чытаць паміж радкоў гэтай апошняй страфы вядомы крылаты выраз Гётэ: “Адзін погляд на чалавечы твар пазбаўляе мяне ад нуды”.

Другі блокаўскі верш, які вызначаец